

Салідарнасць з Украінай ☞ 3

# Ніва


ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ



ЯЎГЕН КАБАТЦ ☞ 5





http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 49 (2534) Год XLIX | Беласток, 5 снежня 2004 г. | Цана 2,00 зл.


*Віцэ-міністр А. Адаровіч: Мы лічым, што [„Ніва” ] гэта добры часопіс. Кантрольная палата задалёка пайшла ў сваіх высновах. Маю надзею, што гэтая справа будзе вырашана на карысць выдаўцоў...*

# Вачыма сеймавай Камісіі



Дэпутат Сейма Ежы Штэліга (СЛД) прапануе, каб кантроль за ходам справы, якую вядзе беластоцкая Пракуратура Беласток-Поўдзень, разглядаючая абвінавачванні ў адрас „Нівы”, узяла Генеральная пракуратура. Такую просьбу ў час аднаго з апошніх пасяджэнняў сеймавай Камісіі нацыянальных і этнічных меншасцей накіраваў ён віцэ-міністру культуры Агнешцы Адаровіч. Тая, аднак, патлумачыла:

— Міністру культуры нельга ўплываць на генеральнага пракурора, каб узяў нейкую справу пад асаблівую апеку. У той момант, калі пракуратура, а пасля суд, пяройме справу — гэта не поле для дзейнняў міністра культуры. Вядома, вакол гэтай справы можа ўзнікнуць грамадскі рух, можна ў розны спосаб падтрымліваць тыя асобы, бо варта.

Дэпутат Штэліга гэтае выказванне так пракаменціраваў „Ніве”:

— Пані міністр з'яўляецца публічнай асобай і мае абавязак падаць адпаведную заяву Генеральнай пракуратуры пасля данясенняў, якія атрымала. Калі не, зраблю гэта я.

Раней віцэ-міністр Адаровіч зазначыла, спасылаючыся на заяву пададзеную ў пракуратуру прадстаўніцтвам Найвышэйшай кантрольнай палаты:

— Калі справа аб часопісе „Ніва”, дык спачуваем. Мы лічым, што гэта добры часопіс. Кантрольная палата задалёка пайшла ў сваіх высновах. Маю надзею, што гэтая справа будзе вырашана на карысць выдаўцоў.

Пытанне „Нівы” ўзняў падляшскі дэпутат ад СЛД Яўген Чыквін, які прыпомніў, што выдаванне штодзённіка фінансуецца за кошт міністэрскіх датацый, а грошы на гэтую мэту паяўляюцца ў сакавіку ці красавіку:

— Гэта прымушае перасоўваць срокі з іншых месяцаў, паміж тым перыядам, калі даецца справаздача, да часу атрымання срокаў з наступнай датацыі. Я не намерваюся кагосьці апраўдваць, але ці вы, як міністэрства, не лічыце, што трэба было б прыняць меры па гарантаванні фінансавай плаўнасці выдаўцам?

Міністр Адаровіч прабавала неяк выбрысці з гэтага пытання:

— Вядома, здараецца так, што з-за праблем з фінансавай плаўнасцю датацыі размяркоўваюцца крыху пазней, чым фармуецца выдавецкі цыкл. У нашым выпадку датацыі назначаныя са спецыяльнага срока могуць пакрываць укладзеныя кошты.

Да абмену выказваннямі на тэму „Нівы” дайшло ў час пасяджэння прысвечанага праекту бюджэтнага закону на наступны год, галоўным чынам у яго частцы прысвечанай выдаткам на культуру меншасцей.

— Урадавая прапанова на 2005 г. асабліва карысная для Міністэрства культуры, — падкрэсліла віцэ-міністр.

— Сродкі на гэтую мэту маюць застацца на сёлетнім узроўні. Прытым міністэрства дэкларуе хадайнічаць за дадатковымі грашамі, напрыклад, з іграў, — сказаў „Ніве” пасля пасяджэння дэпутат Яўген Чыквін.

— Асноўны бюджэт на падтрымку нацыянальных меншасцей у сферы культуры складзе 5 млн. 900 тыс. зл. Уступна падзялілі мы яго на выдавецкую дзейнасць, асноўную ды на звязаную з распаўсюджваннем культуры і мастацкай актыўнасцю, — тлумачыла Агнешка Адаровіч.

І так, згодна праекту бюджэту, на выдавецкую дзейнасць адводзіцца ў наступным годзе 3 млн. 100 тыс. зл., на асноўную — 1 млн. 300 тыс., а на мастацкую і распаўсюджванне культуры — 1 млн. 500 тыс. зл. Крыху большыя сродкі адведзены на выдавецкую дзейнасць з прычыны, як тлумачыць Міністэрства культуры — увядзення падатку ПДВ (VAT) на друкарскія паслугі ды „лавінавы рост колькасці заяў міністру культуры на падтрымку публікацый”. Можна спадзявацца, што названыя 2 млн. 800 тыс. зл. на асноўную ды мастацкую дзейнасць і распаўсюджванне культуры будуць яшчэ папоўнены сродкамі са Спецыяльнага мэтавага фонду, які накіраваны на рэалізацыю пяці нацыянальных праграм культуры і даступны для меншасных арганізацый і ўстаноў.

Дэпутат Ежы Штэліга глядзіць на справу менш аптымістычна, чым прадстаўніца Міністэрства культуры:

— Я заўважаю, што ў чарговы раз няма росту колькасці сродкаў прадбачаных у праекце. Рост гэты ілюзорны, інфляцыйнага характару. Мне здаецца, што працягваем своеасаблівую крывадушнасць калі кажам, што дастаткова некалькі мільёнаў злотых на задавальненне дзейнасці дзесяткаў тысяч людзей, якіх вельмі часта не падтрымліваюць мясцовыя самаўрады. Накіраванне на падтрымку культурнай дзейнасці нацыянальных і этнічных меншасцей сумы, за якую можна купіць адзін урадавы лімузін — проста сорам!

Дэпутат Штэліга намякаў на тое, каб бюджэт на культуру нацменшасцей пабольшыць на 2 млн. зл., хоць бы скарачаючы фінансы на ўтрыманне сеймавай ці прэзідэнцкай канцылярый. Прытым дадаў:

— Не баюся сцвердзіць, што „касу” дзеляць „па ўважлівасці”, па такім прынцыпе, што дэпутат хутчэй даб'ецца да ведамства, бо там яму трэба аформіць нейкі інтарэс. Гэта ўжо чарговы раз складваецца такая сітуацыя, што хтосьці спрабуе нам напусціць дыму ў вочы. Няма тут ніякіх крытэрыяў.

Камісія адным голасам заяву Штэлігі адкінула.

**Мацей Халадоўскі**


## Пасля выбараў ☞ 2

Віктар Сазонаў

*З „адміністрацыйным рэсурсам” узніклі праблемы. Старшыня КДБ Леанід Ерын адразу пасля рэферэндуму быў адпраўлены ў адпачынак. А як „адпачыў”, пайшоў у адстаўку. У народзе наконт гэтага ўжо пачалі складваць анекдоты. Кажуць, што можа варта было б на які месяц даць адпачыць прэзідэнту. Адпачыўшы, можа і ён адставіўся б...*

## Фейс-мейкінг ☞ 2

Аляксандр Вярбіцкі

*Аддзяленне Косава — „калыскі сербства” — ад Югаславіі (якая быццам яшчэ існуе, а быццам і не) лічыцца ўсё ерасцю не толькі ў Бялградзе, хаця раздзяленне і падзел гэтай зямлі — з-за зараду ўзаемнай нянавісці насельніцтва — найбольш сэнсоўныя...*

## Дапамога дзецям ☞ 4

Аляксей Мароз

*У час фіналу аркестра, які будзе праводзіцца 9 студзеня 2005 года ў гарадскім амфітэатры або ў Гайнаўскім доме культуры (залежна ад надвор'я), прадбачваюцца музычны канцэрт, аўкцыён і конкурсы. У ходзе мерапрыемства будуць прадавацца конкурсныя працы выкананыя вучнямі (іконы, паштоўкі) і дары сабраныя ад спонсараў...*

## Юбілей „Васілёчкаў” ☞ 8

Віталь Луба

*Старшыня Рады горада Пётр Кандрацюк падзякаваў „Васілёчкам” за прамоцыю горада і прыгадаў, што хор — аднагодак гурту „Ролінг Стоўнз”, які таксама яшчэ спявае. А бельскі стараста Славамір Снарскі і старшыня Рады павета Уладыслаў Ягела пажадалі сустрэцца на залатым юбілеі, калі „Васілёчкі” будуць спяваць, а „Ролінг Стоўнз” ужо не...*

## Родам з Беласточчыны ☞ 9

Сяргей Чыгрын

*Васіль Сакалоўскі нарадзіўся ў вёсцы Козлікі Заблудаўскай воласці Беластоцкага павета ў 1897 годзе ў сям'і беларускага селяніна-бедняка. Спачатку дома скончыў двухкласную настаўніцкую школу і пэўны час працаваў настаўнікам у вясковай школе...*

## Беларускія спартсмены ☞ 10

Уладзімір Хільмановіч

*Летась нашы тэнісісты для многіх сенсацыйна выйгралі Кубак Еўропы. Сёлета справы ідуць не так гладка. У адборавай групе да фіналу кантынентальнага чэмпіянату беларусы надзвя няўдала выступаюць у родных сценах. Так наша каманда ў першым коле саступіла дома палякам і аўстрыйцам...*


9 770546 196000



# Паслявыбарчыя замалёўкі

Выбары ў Палату Прадстаўнікоў Рэспублікі Беларусь і правядзенне рэспубліканскага рэферэндуму на Беларусі даўно скончыліся. І напачатку было ўсё як і мінулыя разы. Старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі Лідзія Ярмошына абвясціла вынікі. Выбары адбыліся з першага тура. Апазіцыя ў парламент не трапіла. А на рэферэндуме Аляксандр Лукашэнка атрымаў упэўненую і пераканаўчую перамогу. Ды і сам прэзідэнт не сціплічаў, распавядаючы з блакітных экранаў пра ўсенародную падтрымку існай улады. Ён заявіў, што не „адміністрацыйны рэсурс”, а здаровы сэнс беларускага народа вырашыў ход парламенцкіх выбараў і рэферэндуму. Але потым пайшло неяк не так, як раней. Беларускі народ не стаў лікаваць і радавацца з сваёй маналітнасці, здаровага сэнсу і адзінадушша. Міжнародныя назіральнікі публічна, на прэс-канферэнцыі заявілі, што „парламенцкія выбары і рэферэндум не былі ні свабоднымі, ні дэмакратычнымі”. А апазіцыя распавядае пра неверагодную па сваіх маштабах фальсіфікацыю і што ў яе скралі перамогу. Ды і з „адміністрацыйным рэсурсам” узніклі праблемы. Старшыня КДБ Леанід Ерын адразу пасля рэферэндуму быў адпраўлены ў адпачынак. А як „адпачыў”, пайшоў у адстаўку. У народзе наконт гэтага ўжо пачалі складваць анекдоты. Кажуць, што можа варта было б на які месяц даць адпачыць прэзідэнту. Адпачыўшы, можа і ён адставіўся б.

Пра адстаўку Ерына робяцца розныя высновы. Хтосьці сцвярджае, што той убачыў слабасць улады, і як не сама дурны чалавек вырашыў пакінуць карабель, які тоне. Іншыя сцвярджаюць, што старшыня КДБ надумаўся пайсці шляхам свайго расійскага калегі Пуціна, і сам пазмагаецца за прэзідэнцкае крэсла ў 2006 годзе. Ёсць нават думка, што Лукашэнка пазбаўляецца ад сілавікоў звязаных з Масквой. Праўда, ёсць і меркаванне, што найпершы „сілавік” звязаны з Масквой — гэта сам Лукашэнка. Проста яму мала пасады генерал-губернатара. А генералісімус-губернатара Крэмль не дае. Маўляў, там баяцца, што бываюць такія генералісімусы, якім і гэтай пасады мала.

Тэма Расійска-Беларускага Саюза на дзяржаўных беларускай тэлевізіі і прэсе кудысьці прапала. Гэтак жа як і тэма ўсходнеславянскага брацтва. „Браты” Пуцін і Лукашэнка злёталі на Украіну напярэдадні першага тура тамашніх прэзідэнцкіх выбараў, паглядзелі на сітуацыю і з надзеяй што ўсё зрабілі для братана Януковіча вярнуліся дахаты без адкрытай радасці і аптымізму. Пасля гэтага на Беларускай тэлевізіі гавораць толькі пра сваіх „пераможцаў” на сваіх жа выбарах.

„Пераможцы” не сталі паказваць у дачыненні да „пераможаных” такіх якасцей душы як вялікадушнасць і цярпімасць. Тут не толькі за вулічныя акцыі затрымліваюць і караюць. Органы пракуратуры распачалі крымінальны праслед палітыкаў, якія на прэс-канферэнцыі за межамі Беларусі заявілі пра фальсіфікацыю вынікаў рэферэндуму і парламенцкіх выбараў. Цікава, чаму так баяцца пераможаных, і слабых? Старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі сама ж заяўляла, што палітычныя партыі маюць нязначную падтрымку. Можа таму, што „пераможаныя” адчулі смак перамогі і цяпер іх ужо не спыніць.

Міжнародная супольнасць таксама не хоча верыць афіцыйнаму Мінску. Паводле службы Гелапа, улада не змагла сабраць патрэбную для змены Канстытуцыі колькасць галасоў. А абраны парламент не мае нічога агульнага з сапраўдным волевыяўленнем беларускага народа.

Праўда, сам беларускі парламент не звяртае на такія думкі ўвагі. Ён ужо распачаў сваю дзейнасць. Спікера абралі новага, „курс” пакінулі стары. Новы спікер Уладзімір Канаплёў заявіў, што парламент будзе працаваць у „цесным кантакце” з урадам. І яшчэ ён выдаў, што еўрапейскія структуры мусяць першымі зрабіць крокі, скіраваныя на супрацоўніцтва з Беларуссю.

Ну а што народ? Народ глядзеў на публічнае падпісанне прэзідэнтам вынікаў рэферэндуму па тэлебачанні. Там ён убачыў і новых дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, і старшыняў аблвыканкамаў, кіраўнікоў абласных Саветаў, сяброў Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу трэцяга склікання, кіраўнікоў буйных фінансавых і гаспадарчых прадпрыемстваў. На свае вочы ўбачыў падзел, паміж „мы” і „яны”. Падумаў, якая яго, народа, роля ва ўсім гэтым. А назаўтра папаўзлі расказы пра сябра выбарчай камісіі, які адмовіўся ад заробку за сваю працу ў камісіі, бо не лічыць, што яму там дазволілі папрацаваць. І яшчэ пра аднаго сябра камісіі, які хоць сам і галасаваў за змены ў Канстытуцыі, і падтрымлівае сённяшнюю ўладу, але прыйшоўшы дахаты плакаў. Народ стаў думаць пра справядлівасць і шукаць новых герояў. Выбары для яго не закончыліся. Яны толькі пачаліся.

**Віктар Сазонаў**

# Медыяльны фейс-мейкінг



У 40-м нумары „Нівы” з’явіўся артыкул Яўгена Мірановіча „Натаўская агрэсія на Югаславію”. Матэрыял цікавы, але патрабуе крыху дапаўнення.

У „Прыгодах добрага ваякі Швейка” ёсць такое выказванне: „Калі б не было Аўстрыі, яе трэба было б прыдумаць”. Неўзабаве імперыі не стала, а на яе месцы ўзніклі м.інш. Чэхаславакія і Югаславія; апошняя з іх, як падкрэсліваецца ў артыкуле, прыдумана дзеля падтрымкі тэрытарыяльных інтарэсаў славенцаў і харватаў. З таго часу свет крыху змяніўся, дзяржаўныя межы стала падмываць глабалізацыя. У згуртаваных у адной дзяржаве, але сканфліктаваных сусветнымі войнамі народаў змяніўся і носьбіт югаслаўскай ідэі.

У артыкуле Я. Мірановіча згадваецца, што ў Славеніі і Харватыі праводзіліся інвестыцыі з цэнтральнага бюджэту, але змоўчваецца, адкуль той бюджэт сілкаваўся. І менавіта не мінуўшчына, але перамеркаванне бюджэтных сродкаў, большасць якіх выпрацоўвалася на поўначы Югаславіі, яшчэ ў эпоху Ціты — перад аб’яднаннем інтрыганоснай Нямеччыны — выклікала цэнтрабежныя настроі ў найбагацейшых рэспубліках. Не трэба вялікай хітрасці, каб здагадацца, куды тыя грошы траплялі — хопіць глянуць на варшаўскія дзяльбы, хаця б на размеркаванне сродкаў Нацыянальнага фонду здароўя ці еўрасаюзных; пратэставалі падляшскія самаўрадаўцы і парламентарыі, у тым ліку і „ўсяпольскія”, але адбіткі пальцаў службы дзяржпарадку ўзялі ў беларускіх рэдактараў... У Югаславіі дзяліў Бялград і не падазраваю, што Македонія ці Косава лепш там трактаваліся, чым тут наша Падляшша.

У канстытуцыях і вайсковых прысягах прынцыпова прысутнічае фраза пра абарону тэрытарыяльнай інтэгральнасці дзяржаў. Спадзяюся, што такія засцярогі былі і ў постаўстрыйскіх дзяржаўных утварэннях. Ёсць і міжнародныя дэкларацыі аб праве народаў на самастанаўленне, якія, спадзяюся, таксама былі падпісаны Прагай і Бялградам. Палажэнні гэтых дакументаў бываюць супярэчлівыя, аднак у прынцыпе прызнаецца вяршэнства міжнародных абавязацельстваў; гэты прынцып спрацаваў у Чэхаславакіі. У Югаславіі ж наадварот і „вайна ўсіх з усімі стала непазбежнай”.

Згаданая супярэчлівасць, нягледзячы на „антысербскую палітыку краін заходняй Еўропы”, паставіла ў пат вырашэнне косаўскай праблемы. Аддзяленне Косава — „калыскі сербства” — ад Югаславіі (якая быццам яшчэ існуе, а быццам і не) лічыцца ўсё ерассю не толькі ў Бялградзе, хаця раздзяленне і падзел гэтай зямлі — з-за зараду ўзаемнай нянавісці насельніцтва — найбольш сэнсоўныя. Сербскі патрыярх Павел, які шмат гадоў быў прызрэнскім мітрапалітам, у сёлетнім велікодным пасланні наконт Косава напісаў: „Зямля — Божая, і атрымае яе той, хто Ягоны”.

Прызнаюся, што ў пачатку югаслаўскай вайны я шчыраваў за сербамі, што яны вось-вось... І вельмі моцна мяне расчаравалі традыцыйна прыхільныя сербам і аўтаномныя, амаль адсутныя ў НАТО, французы, якія паслалі сваіх авіятараў бамбіць сербскія пазіцыі. Але не здзіўляла ўжо прымірэнне пасля бамбёжак сербаў, што „найменш хацелі вайны”, ды пешчання „ўзброеных арабскімі краінамі, заходняй Еўропай і Амерыкай” харватаў і мусульман.

У пачатку сямідзесятых гадоў „Express Wieczorny” вялікім шрыфтам абнародаваў, што прафесар Кахманскі з глівіцкай політэхнікі абверг тэорыю рэлятыўнасці Эйнштэйна. І што? І нічога — згодна догме не памыляецца толькі рымскі папа. Сёння прадстаўлены прафесарам Мірановічам прафесар Вальдэнберг гэтаксама абвяргае „амаральнасць механізмаў сучаснай сусветнай палітыкі”, якую так рупліва скрывала, напрыклад, польскае тэлебачанне перад гледачамі.

У сувязі з тым, што ў тутэйшым уяўленні агрэсія можа быць толькі натаўская, зацікавіў мяне адзін, мо крыху дзіўны — экстрасэнсавы, — аспект ранішняга туалету Яўгена Мірановіча. Інтрыгуе мяне, ці ў той час, калі ён голіцца, не паказваецца яму ў люстры той Мі..., Мі..., ну, як яго... Рэдактар Мілевіч!

**Аляксандр Вярбіцкі**

**Вачыма еўрапейца**

# Зайздрасць за Украіну



З захапленнем, але перш за ўсё са свайго роду зайздрасцю назіраў я за тым, што дзеялася ў апошнія дні на Украіне. Захапляўся гэтым нацыянальным парывам, адвагай грамадства і рашучасцю, з якою ўсчалі змаганне за праўду і каштоўнасці дэмакратыі. Зайздросціў, бо думаў аб беларусах і іх дзяржаве. Таксама аб паводзінах заходняга свету пасля другога тура ўкраінскіх прэзідэнцкіх выбараў ды аб беларускіх выбарах і рэферэндуме. Найперш склалася ўражанне, што паводзіны і пазіцыі ў справе выбарчых парушэнняў у Беларусі былі толькі „практыкаваннем” перад пазнейшымі ўкраінскімі падзеямі. Пасля, аднак, стала перада мной пытанне, каго мелі б перад асабістым прыездам у Мінск падтрымліваць прадстаўнік па замежных справах ЕС Хав’ер Салана ці прэзідэнт Аляксандр Кваснеўскі. Не дайшло там да масава выказанай грамадзянскай непаслухмянасці, значыць, цвёрдага і адназначнага выказання волі народа, супраціву. Я зразумеў, як шмат заходні свет мусіць яшчэ зрабіць, каб паказаць беларусам, што дэмакратычная Еўропа гэта дабро, што лепш жыць у адкрытай дзяржаве з незалежнымі сродкамі масавай інфармацыі і захоўваннем правоў чалавека, раней, дарэчы, патлумачыўшы тыя законы. А на тое часу няшмат — толькі да будучага года і прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі. Якія-небудзь дзеянні ў гэтым напрамку будуць усё цяжэйшыя. Не без рацыі легендарны шэф польскай секцыі Радыё „Вольная Еўропа” Ян Новак-Езяранскі пераконваў у апошні час: „...тое, што засталося ад незалежнасці Беларусі, здаецца быць пад больш непасрэднай пагрозай. Сярод краін, якія выйшлі пасля распаду СССР, Беларусь, здаецца, гэта найслабейшае звяно, адзіная дзяржава, кіраваная ў старым стылі былымі савецкімі партыйнымі бюракратамі”.

Уладзімір Пуцін, які прайграў бітву за мацнейшую Украіну, хаця б толькі з-за амбіцыйных прыкмет, не адпусціць слабейшай Беларусі, як усё паказвае гледзячы на ход падзей у Кіеве — апошняму буферу аддзяляючаму Расію ад краін ЕС. Тое, што будзе пакінута сам-насам і разбітая беларуская апазіцыя, спрычыніцца да таго, што, спасылаючыся на словы Яна Новака-Езяранскага, Польшча стане твар у твар з адраджаючайся імперыяй, якая па сваёй натуры намерваецца расшырыць свае ўплывы на слабейшых суседзяў. Прытым у той сітуацыі не апынулася б адна Польшча, але і ўз’яднаныя ў сённяшнім кшталце іншыя дзяржавы Еўропы, як, напрыклад, Прыбалтыка.

Я пагаджаюся з выказваннямі, што Польшча як найхутчэй павінна выпрацаваць палітыку падтрымкі дэмакратычных сіл у Беларусі і затым абуджэнне грамадскай, нацыянальнай свядомасці. Прытым не можа гэтага рабіць у адзіночку, не толькі таму, каб афіцыйная беларуская ўлада і Крэмль не ўспрынялі гэтага як зачэпную палітыку. У Еўропе Польшча мае па гэтай прычыне натуральных саюзнікаў у Вільні, Рызе і Таліне. На жаль, сёння пры вялікім высілку магла б для гэтай мэты здабыць у рамках Веймарскага трохвугольніка таксама Берлін і Парыж, разлічваючы на Прагу і Будапешт, ствараючых Вышаградскую групу. Не ўспомню тут аб лабіраванні дзеля Беларусі ў Вашынгтоне. Аднак, найперш Польшча мусіць сабе адказаць канкрэтна і ясна, навошта ёй самой патрэбна Беларусь з поўнасцю дэмакратычнай сістэмай, не толькі як сусед, але і незалежная і эканамічна набіраючая сілы дзяржава. Азначала б гэта акрэсленне пазіцыі Польшчы як лідэра ў дапамозе пры замене русіфікацыі на еўрапеізацыю Беларусі з усёй сістэмай каштоўнасцей, а перш за ўсё, на сённяшнім этапе, крышталізацыяй пачуцця нацыянальнай асобнасці, своеасаблівасці. Барані Божа, без каланіяльнага ўхілу ды павучання.

**Мацей Халадоўскі**

# Dziś Ukraina — jutro Białoruś!

Падзеі ў Кіеве падагрэлі атмасферу ў Польшчы. На працягу апошняга тыдня палякі раптам сталі еўрапейцамі. Гаворка пра тысячы людзей, што выйшлі на вуліцы ўсіх гарадоў і адназначна падтрымалі дэмакратычныя памкненні ва Украіне.

Беласток не хацеў заставацца горшым! Праўда, спантаннасці было тут як на лякарства...

І саміх удзельнікаў мітынгу сабралася толькі за сотню — палову публікі складалі палітыкі, другую журналісты. Справа ў дэзінфармацыі. Дзень раней нават журналісты не ведалі ў колькі гадзін пачнецца мітынг. Ды яшчэ з неба ўляпіў дождж са снегам.

Самую вялікую групу склалі маладыя з Грамадзянскай платформы з еўрадэпутаткай прафесар Барбарай Кудрыцкай. З'явіліся падляшскія салідарнікі з Юзэфам Мазалеўскім і прэзідэнт горада Рышард Тур.

— Мы за дэмакратыю і волю ўкраінскага народа! — дэкларавалі па чарзе. Самым папулярным воклічам быў тут агульнапольскі лозунг:

— Ukraina! Bez Putina!

— Ale i wymyślili, że lepiej nie można, — каменціравалі задаволена дзядзькі з „Салідарнасці", якія відавочна ажывіліся і падбадзёрыліся.

На мітынгу з'явіліся і студэнты-эмігранты з Беларусі, якія паднялі бел-чырвона-белы сцяг. З прамовай у падтрымку дэмакратыі выступіў прадстаўнік беларускіх бежанцаў Ясь Абадоўскі з Магілёва.

— Dziś Ukraina! Jutro Białoruś! — скандзіравалі мітынгоўцы.

У цудоўную перамену беластоцкіх палітыкаў не паверылі нацыянальныя меншасці Беласточчыны.

Поўнасцю адсутнічалі лідэры ўсіх нацменаў, нават украінцаў



Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Падляшша. Сярод „меншасных" асабістасцей з'явіўся толькі былы ўпаўнаважаны ваяводы па справах нацыянальных меншасцей Славамір Галіцкі. Чамусьці замест аранжавага сцяга ў яго руках красаваўся чорны парасон.

— А хто тут арганізатар? — пытаю хлопца ў куртцы з рэкламай Грамадзянскай платформы.

— Усе правыя, — чую адказ.

— І LPR?

— Oni, niestety, nie.

Пасля прызнання мой субяседнік цяжка ўздыхнуў. Але не было часу настальгаваць, бо якраз усё заглушыў дзяржаўны гімн „Jeszcze Polska nie zginęła". Пасля прагучэла „Шчэ нэ вмэрла Украіна" — і трэба было быць на пляцы, каб пабачыць дзіўназадаволены твар Юзэфа Мазалеўскага.


Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Пешаходы, якія выпадкова апынуліся на пляцы перад помнікам Пілсудскага, паводзілі сябе стрымана. З падазронасцю глядзелі на мітынгоўцаў і абыходзілі іх шырокай дугою:

— To jeszcze nie wiadomo, jak to się wszystko skończy! — каменціравалі дзядзькі, якія трымаліся на бяспечнай адлегласці.

Калі гаварыць пра сам мітынг — закончыўся ён раптоўна, як і пачаўся. Разахвочаныя маладзёны папракалі палітыкаў:

— Маглі б хоць бы якую „Чарамшыну" запрасіць, каб паспявала. А то выступілі для тэлебачання і накрыліся хвастамі!

Прысутныя на мітынгу беларусы расказвалі гісторыю гродзенскага журналіста Паўла Мажэйкі, якая ўжо кружыць па Беларусі як анекдот. Гэтым разам кінулі яго ў турэмную камеру разам з крымінальнікамі. Калі пасля сямі дзён галадоўкі Мажэйку выпусцілі з турмы, той першыя крокі накіраваў у кіёск і накупляў за ўсе грошы папяросаў для сваіх таварышаў па няшчасцю. Аказваецца, нават рэцыдывісты падтрымалі яго ў змаганні за Беларусь!

Нягледзячы на расчараванне і недахоп братэрскіх акцэнтаў, і тут на міг спрацавала аранжавая салідарнасць з Кіевам.

У народ пайшоў здаровы імпульс. Калі з сяброўкамі мы вярталіся аздобленыя аранжавымі бантамі і хусткамі, нас выпадковыя пешаходы з усмешкай віталі: Юшчэнка!

Адказ тут адзін:

— Lepszy Juszczenka, niż Łukaszenka!

**Ганна Кандрацюк**

# З гарадскімі памкненнямі

Калі ехаць шашою з Бельска ў бок Сямятыч, перад Кнарыдамі ўвагу прыцягвае блакітная каплічка, што стаіць сярод сенажаці. Калі яна была пабудавана, жыхары мясцовасці не надта ведаюць, адно толькі нядаўна перабудавалі яе, амаль удвая пашыраючы. Каплічка каля Кнарыд стаіць невыпадкова: з-пад яе б'е крыніца крышталёвай вады. Вада выплывае бесперапынна — і ў засуху, і ў мароз. Абапал трубы з крынічнай вадой вісяць два металічныя кубачкі. Капліца — на маё здзіўленне — не замкнёна. Калі я гэтае здзіўленне выказаў сустрэтаму жыхару вёскі, ён мне адказаў, што нічога каштоўнага ўсярэдзіне няма, бо і зладзеі заглянулі туды бадай толькі адзін раз. Побач капліцы крыху ахвярных крыжоў... Раз у год, у Пяценку, адбываецца ў капліцы набажэнства; спраўляе яго бацюшка з Боцькаўскага прыхода, да якога належаць Кнарыды. На паўночным канцы вёскі, на могілках, стаіць драўляная царкоўка, у якой набажэнства адбываецца раз у месяц. На могілках хаваюць не толькі праваслаўных, але і мясцовых католікаў, а нават і шляхту.

У Кнарыдах найбольш праваслаўных, якіх адсотак за апошнія дзесяцігоддзі паменшаў у выніку іх міграцыі ў каталіцызм. Жывуць тут і дзве сям'і суботнікаў.

У вёсцы каля 160 хат, з якіх пад дваццаць пустуе; адну купіў нехта з Польшчы. З самое гаспадаркі жыве мо толькі дзесяць сялян, з ліку якіх толькі адзін малады. Людзі трымаюць галоўным чынам кароў; пецярых гаспадароў мае ўмяшчальнікі, апошнія здаюць малако ў мясцовы пункт скупкі. У Кнарыдах пражывае каля дваццаці кавалераў, але толькі адзін з іх абрабляе гаспадарку, а апошнія жывуць пры бацьках.

З вуліцы Кнарыды крыху нагадваюць мястэчка з-за архітэктурнага плюралізму тамашніх збудаванняў. Стаяць там, быццам народнае апалчэнне, і хаты пад саламянай страхой, і мураванкі. Дамы абабіты і шалёўкай, і сайдынгам, і тынкам, і без дадатковай вонкавай аблічоўкі. Вокны любой велічыні ад адна- да шасцістворкавых. Найбольшы ў вёсцы мураваны будынак былой школы, узведзены недзе ў пяцідзесятых гадах. Школа была закрыта нейкіх пяць гадоў таму і сёння яе частка служыць вытворчасці мэблі. Недалёка школы стаіць і драўляная святліца, але і яна рэдка служыць сваім мэтам. Не ладзяць у ёй і вяселляў, бо для гэтых мэтаў людзі выбіраюць Бельск; у святліцы вяселле адбылося толькі раз, калі выходзіла замуж дзяўчына з суседняй са святліцай хаты. І адзін раз у святліцы адбылося каталіцкае набажэнства...


Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

*Вуліца ў Кнарыдах*

Водапровад у Кнарыдах працуе ўжо больш за пятнаццаць гадоў. Жыхары вёскі зацікаўлены і каналізацыяй, але да 2006 года ніякі зрух у гэтым напрамку не прадбачваецца. Яшчэ нядаўна ў Кнарыдах працавалі дзве крамы, цяпер асталася толькі адна.

Зямля ў Кнарыдах нядрэнная, але праца земляроба цяжкая. Таму і складваецца ўражанне, што ўсё ж такі жыхары гэтай вёскі больш тужліва глядзяць на недалёкі Бельск, чым на свае адметныя сядзібы і навакольныя гектары. **(ав)**

## Кузава дошкамі не забітая

У „Кур'еры паранным" ад 5 лістапада г.г. друкаваўся артыкул Збігнева Нікітаровіча „Narobił długów i zwala na ojca". Героем чарговай сенсацыі, выкрытай асам беластоцкай журналістыкі, быў шэф беластоцкай СЛД Мікалай Парфянюк, ураджэнец... Кузавы. Збударажыла мяне тое, што беластоцкі пінкертон піша аб маёй вёсцы так: „Nam udało się ustalić, że drugi Mikołaj Parfieniuk to... ojciec szefa SLD (...) **Mieszka w zabitej deskami wiosce Kuzawa koło Czeremchy przy polsko-białoruskiej granicy**". Не ведаю, хто быў інфарматарам журналіста, але, на маю думку, гэта яго асабістая прадузятасць! Гэтымі абсурднымі сказамі кляйміць ён кузаўскую грамадскасць. Разумею, што аўтару залежыць на тым, каб кампраметаваць беларусаў (не стану перажоўваць ягоныя артыкулы наконт „Нівы"). Аднак прапаную яму прыехаць у вёску і праверыць факты на месцы.

Вёска Кузава спалучаецца з Чаромхай-Станцыяй. Раздзяляе яе адно рэчка Нурэц з боку вуліцы Вішнёвай. У вёсцы 105 дамоў. Праўда, каля пятнаццаці пустуе, але ў летнім сезоне многія з іх засяляюць гарадскія сваякі або дзеці былых гаспадароў. У вёсцы ёсць святліца і крама, пабудаваныя ў грамадскім пачыне (гэта апошняя, пасля занепаду ГСу з'яўляецца ўласнасцю прыватнага прадпрымальніка). Вуліца тут асфальтаваная. Сядзібы гаспадарскія задбаныя. Прыгожыя агароджы. Шыферныя дахі мяняюцца на бляшаныя. Больш за дзесяць гадоў маем водаправод. У кожнай хаце тэлевізар, жыхары карыстаюцца пральнымі машынамі, сучаснай кухоннай тэхнікай ды ваннамі. Ёсць царква і свой прыход. Кузаўцы ўдзельнічаюць у культурных мерапрыемствах, арганізаваных у Чаромсе. Адна праўда — вёска старэецца. Але гэта не значыць, што яна забітая дошкамі.

**Уладзімір Сідарук**

## Нерэнтабельнасць

У вёсцы Чаромха працуюць два пункты продажу будаўнічых матэрыялаў — на бензастанцыі варшаўскай фірмы „Эльваб" ды ў краме „Селях" мясцовага прадпрымальніка. Многія чарамшане і жыхары навакольных вёсак абеспячаліся тут таварам, паколькі цэны наогул даступныя і выбар вялікі. З таго што мне вядома, з пачаткам наступнага года ліквідуюцца абедзве крамы. Прычына вядомая — нерэнтабельнасць.

— Заплаціць складчыну ЗУС за працаўніка 2 400 зл. гэта вялікі выдатак, — гаварыў мне Лявон Селях. — Павышэнне стаўкі ПДВ на 22% паўплывала на павышэнне цэнаў. А падаткі, кошты электраэнергіі ды іншыя выдаткі? Аб прыбытку не гаворыцца. Не аплачваецца такі бізнес. З пачаткам студзеня ліквідую краму.

Такое ж пачуў я і ад кіраўніка „Эльвабу". **(ус)**

# Дапамагчы хворым дзецям



Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

*У павятовым штабе аркестра працуюць (справа) Маргарыта Дзік, Лукаш Кавальчык, Стэфан Вілюк і Кшыштаф Чарнэцкі*

У Гайнаўцы грошы для Вялікага аркестра святочнай дапамогі збірае моладзь ужо 12 гадоў. Арганізаваныя мерапрыемствы ў рамках аркестра ладзяцца ад 5 гадоў. У мінулым годзе заснаваны быў павятовы штаб аркестра, які каардынаваў акцыю моладзі, якая ў большасці гмін Гайнаўскага павета збірала сродкі на лячэнне дзяцей. Зараз у павятовым штабе рыхтуюцца да правядзення на Гайнаўшчыне чарговых мерапрыемстваў Вялікага аркестра святочнай дапамогі, якога нязменнай мэтай з'яўляецца збіранне грошай на дапамогу хворым дзецям.

У час фіналу аркестра, які будзе праводзіцца 9 студзеня 2005 года ў гарадскім амфітэатры або ў Гайнаўскім доме культуры (залежна ад надвор'я), прадбачваюцца музычны канцэрт, аўкцыён і конкурсы. У ходзе мерапрыемства будуць прадавацца конкурсныя працы выкананыя вучнямі (іконы, паштоўкі) і дары сабраныя ад спонсараў. Некаторыя прадметы арганізатары аркестра хочуць прадаваць па Інтэрнэце. У сталоўцы прадпрыемства „Фурнэл" будзе выступаць, між іншым, выпускнік гайнаўскага белліцэя Мар'юш Ажахоўскі. Будуць там прэзентавацца рэгіянальныя стравы. Дзень раней за грашовай успамогай аркестру можна будзе ўвайсці на матч валейбольнай лігі, з удзелам гайнаўскай каманды „Мадэратар", які адбудзецца ў спартыўнай зале белліцэя. Аднак у павятовым штабе апасаюцца арганізаваных дзеянняў, якія могуць перашкодзіць у працы аркестра.

— У Гайнаўцы не дзейнічае „Вшэхпольская моладзь" і таму не прадбачваем, што менавіта яны будуць нам перашкаджаць. Аднак непрыхільныя нашай працы асобы могуць паспрабаваць перашкодзіць правесці канцэрт або збіраць грошы ў бляшанкі. Таму моладзь будзе хадзіць у групах, па тры чалавекі. Дзве асобы будуць збіраць грошы, а трэцяя будзе хадзіць з сотавым тэлефонам і ў выпадку небяспекі будзе паведамляць аб здарэнні паліцыю, — кажа каардынатар гайнаўскага штаба Кшыштаф Чарнэцкі.

— Правядзенне фіналу аркестра гэта вельмі добрая нагода, каб дапамагчы хворым дзеткам. Ёсць ахвотныя збіраць грошы ў дзень фіналу. Аднак арганізацыйны штаб мусіць працаваць некалькі месяцаў, каб быў эфект. Я ангажуюся ў працу аркестра, бо гэта дае мне многа радасці, — гаворыць белліцэістка Маргарыта Дзік, якая з'яўляецца першым намеснікам шэфа штаба. — У мінулым годзе мы тры цэлыя дні працавалі перад фіналам. Аднак адчувалі радасць, што многа зрабілі.

— Вялікі аркестр святочнай дапамогі гэта адно з мерапрыемстваў, якое моладзь пачала ладзіць у Гайнаўцы сама. Вучні самі пачалі іграць побач беларускага музея і збіраць грошы ў бляшанкі. Пасля моладзь пачала арганізаваць у рэстаране „Белая ружа". Апошнім разам штаб знаходзіўся ў Доме культуры, а ў бляшанкі грошы збіралі гайнаўскі стараста і бурмістр, — тлумачыць Кшыштаф Чарнэцкі, які ўжо пяты раз дапамагае арганізаваць акцыю. — У мінулым годзе мы звярнуліся з заклікам да моладзі з-па-за Гайнаўкі і атрымалі станоўчы адказ. Грошы для аркестра збіралі ў большасці гмін. Моладзь не хадзіла па дамах, але стаяла са скрынкамі каля цэркваў і касцёлаў. Разам у пачатку гэтага года сабралі больш за 20 тысяч злотых.

У гэтым годзе гайнаўскія арганізатары аркестра намерваюцца сабраць больш сродкаў ад продажу рэчаў па Інтэрнэце. Перад фіналам па Інтэрнэце будзе праводзіцца аўкцыён на вылучэнне хроснага бацькі для маладога зубраняці з Белавежскага нацыянальнага парку. Такім жа самым спосабам будуць прадавацца іконы і паштоўкі, якія дашлюць удзельнікі конкурсу. Сцяпан Чабай з Новага Беразова давязе на аўкцыён два страусавыя яйкі. У павятовым штабе прадбачваюць, што каля 200 вучняў з гімназій і сярэдніх школ Гайнаўскага павета будуць збіраць грошы амаль ва ўсіх гмінах Гайнаўшчыны. Сёлета хочуць выступіць за непасрэдную дапамогу для гайнаўскай бальніцы.

— Спадзяемся, што на гэты раз збярэм яшчэ больш грошай, чым у мінулым годзе, — кажа шэф павятовага штаба Лукаш Кавальчык. — Ад працы ў аркестры не застаецца нам ні залатоўка, а некаторыя асобы адмоўна ацэньваюць нашу работу, без пашаны.

— Яшчэ ў Гайнаўцы не здарылася, каб нейкая бляшанка была адчынена перад яе здачай у штаб, або каб загінулі грошы, — тлумачыць спадар Чарнэцкі. — Больш грошай збярэм, калі ўдасца нам адчыніць свой банкаўскі рахунак.

— Найлепш было б, каб медыцынскае абсталяванне для дзяцей было непатрэбнае. Ніякія грошы не кампенсуюць перажыванняў дзяцей і бацькоў, — дабаўляе другі намеснік штаба Стэфан Вілюк.

**Аляксей Мароз**

# *Перспектывы Бельскага павета*

*Галоўным гаспадарчым цэнтрам Бельскага павета з'яўляецца сам Бельск-Падляшскі.*

*У канцы 2001 года ў Бельскім павеце дзейнічала (без земляробаў) 4 820 суб'ектаў гаспадарання (рост на 29,8% у параўнанні з годам раней), з чаго 147 належалі да публічнага сектара ўласнасці, а 4 673 (97%) да прыватнага. У 2002 годзе працаваў 4 201 суб'ект (спад на 12,8%), з чаго 96% было прыватных. З іх ліку звыш 60% дзейнічае ў Бельску.*

*Галоўнымі дзелавымі сферамі ў канцы 2001 года былі: гандаль і паслугі (28,8%), перапрацоўчая прамысловасць (10,3%), будаўніцтва (9,1%), навука ды абслугоўванне нерухомасцей і фірмаў 6,1%), транспарт, складаванне і сувязь (6%), земляробства і лясніцтва (4,7%), ахова здароўя і сацыяльная апека (3,5%), фінансавае пасрэдніцтва (3,2%), адукацыя (2,2%), гатэлі і рэстараны (1,7%) ды іншая дзейнасць (6%).*

*Інвестыцыйныя ўкладанні прадпрыемстваў упалі з 64,9 млн. злотаў у 2000 на 36,5 мільёна ў 2002 годзе. Рэцэсія абышла толькі прамысловасць і будаўніцтва, у якіх у той жа перыяд наглядаўся звыш трынаццаціпрацэнтны рост. У 2002 годзе найбольш інвеставалася ў прамысловасць і будаўніцтва (63,3%), рыначныя паслугі ((35,1%), пазарыначныя паслугі (1,1%) ды ў земляробства і лясніцтва (0,5%).*

*У канцы 2000 года з ліку 28 308 штатных працаўнікоў 19 413 (68,6%) працавала ў лясной і сельскай гаспадарцы, 3 817 (13,5%) у прамысловасці і будаўніцтве, 2 975 (10,5%) у пазарыначных і 2 103 (7,4%) у рыначных паслугах.*

*За два чарговыя гады наступіў звыш 32%-ны спад ліку працоўных да 19 153 асоб, з каторых 11 185 (58,4%) займалася земляробствам і працай у лесе, 3 172 (16,6%) у прамысловасці і будаўніцтве, 2 753 (14,3%) у пазарыначных і 2 043 (10,7%) у рыначных паслугах.*

*Найбольшымі працадаўцамі былі бельскія фірмы. „Hoop S.A." (вытворчасць напояў), дзе працавала 502 асобы, з'яўляецца адной з найбольшых у нашай частцы Еўропы. Адгэтуль папулярныя напоі трапляюць у склады і крамы не толькі Польшчы, але і за мяжу (Германія, Расія, Скандынавія).*

*Улік суб'ектаў гаспадарання ахоплівае ў Бельску чатыры тысячы прадпрымальнікаў. Гаспадарчай дзейнасці спрыяюць выдатна прагрэсіруючыя банкаўскія паслугі. У Бельску працуе аж восем банкаў і гэта незвычайнасць у маштабе краіны для гарадоў да 40 тысяч жыхароў.*

*Папулярнай галіной гаспадарчай дзейнасці з'яўляецца перапрацоўка збожжа. Хуткімі тэмпамі развіваецца і перапрацоўка драўніны. У павеце дзейнічае звыш шасцісот крамаў, з якіх сорак працэнтаў — спажывецкія. Большасць крамаў у гарадах — Бельску і Браньску.*

***Міхал Мінцэвіч***

# Трохгалоссе Кабацаў

У лістападзе ў Асяродку прапагандавання рэгіёна ў Гайнаўцы Мікола Бушко і яго супрацоўнікі арганізавалі спатканне з Яўгенам Кабатцам, аўтарам перакладаў на польскую мову беларускіх твораў „Людзі на балоце” Івана Мележа, „Трэцяя ракета” Васіля Быкава і апавяданняў Янкі Брыля. Размова з госцем была наладжана ў рамках „Творчага трохгалосся Кабацаў”. Бацька Яўгена Кабатца выводзіцца з Беглюкоў, распаложаных побач Нараўкі. Там узрасталі дваюрадныя браты літаратара і перакладчыка — гайнаўскі мастак Віктар Кабац і беластоцкі архітэктар, праектант царкваў Ян Кабац. Арганізатары мерапрыемства рашыліся наладзіць сустрэчы з трыма братамі Кабацамі.



Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

*Яўген Кабатц лічыць, што трэба ўступаць дзеля напісання супольнай гісторыі з суседзямі*

— Беласточчына знаходзіцца на скрыжаванні паміж візантыйскім усходам і міжземнамор’ем. Тут ствараецца еўрапейская культура, якая з’яўляецца часткай сусветнай культуры, — заявіў Яўген Кабатц, які спасылаўся на карані сваёй сям’і. Да 16 гадоў, разам з бацькамі, жыў ён у Ваўкавыску. Прыязджаў у родныя Беглюкі, Нараўку, Гайнаўку і Белавежскую пушчу. У 1946 годзе ў час рэпатрыяцыі пераехаў жыць на захад Польшчы. Пасля працаваў у Італіі, як аташэ па справах культуры і навукі. Паколькі выводзіўся ён з праваслаўнай сям’і, шукаў візантыйскіх каранёў у італьянскай гісторыі і культуры. Свае досведы апісаў у кніжках аб Італіі. Яшчэ на пачатку спаткання госць растлумачыў адкуль у яго прозвішчы ўзялася літара „т”. Калі пайшоў ён вучыцца ў школу, нямецкі настаўнік напісаў яму ў канцы прозвішча літары „tz”, якія пасля палякі перамянілі на „tc”.

— Я астаўся ў літаратуры са сваёй канцэпцыяй — „каб мы маглі быць міласэрнымі і зычлівымі чалавек да чалавека”, — сказаў літаратар. Польскім чытачам вядомы ён як намеснік галоўнага рэдактара часопіса „Літаратура на свеце”, аўтар польскамоўных кніжак і перакладаў з італьянскай мовы на польскую, аб якіх расказваў у час спаткання. Некаторыя пытанні тычыліся кніжкі „Айцец Піо”. Расказваючы пра Італію звярнуў ён увагу на каталіцкі касцёл у Бары, дзе ў падвале знаходзяцца мошчы свяціцеля Мікалая Цудатворца. Яшчэ пры Народнай Польшчы прыязджала туды многа праваслаўных паломнікаў з усходнеславянскіх краін, якія маліліся ў падвале. Беларускі пісьменнік Ян Чыквін спытаў пра апошнюю кніжку, якую піша Яўген Кабатц.

— Будучы кароль Ягайла 11 студзеня падпісаў у Ваўкавыску дамову з палякамі. Я нарадзіўся таксама 11 студзеня ў Ваўкавыску. Пішу аб гэтым у маёй новай кніжцы. Вяртаюся я ў ёй да часоў аб’яднання Вялікага княства Літоўскага з Польшчай. Няма што гаварыць аб уніі дзвюх дзяржаў, але аб інкарпарацыі Літвы ў склад Польшчы, — гаварыў Яўген Кабатц.

— У нас кожны крыху мастак, літаратар, паэт. У Скупаве, Семяноўцы ці Дубічах людзі цікавіцца прыродай і крыху „філасофствуюць”. Многа таленавітых людзей выйшла з нашых зямель, — заявіў мастак Віктар Кабац, маючы на ўвазе таксама свайго дваюраднага брата. Некалькі дзён пазней у Гарадской бібліятэцы ў Гайнаўцы адкрыў ён выстаўку мастацкіх прац выкананых у час паломніцтва ў Вільню. Гайнаўскі мастак, ідучы пяшком праз Беларусь, рысаваў пяром і тушшу прыдарожныя крыжы і каплічкі. На Беласточчыне і Літве заўважыў многа старых помнікаў хрысціянства. У Беларусі пры дарогах стаяць новыя крыжы і каплічкі. **(ам-з)**

# Што робяць таварыствы?

Уважліва наглядаю за ўсялякімі ініцыятывамі, накіраванымі на падтрымку або фармаванне нацыянальнай тоеснасці праваслаўнага насельніцтва Сямятыцкага павета і неяк, апрача некалькіх музычных фэстаў у сталіцы павета і трыма-чатырма ў гмінах, нічога не магу заўважыць. Памятаю часы, калі БГКТ гуртавала на Беласточчыне сотні членаў у гуртках і аддзелах. Тады бурліла культурная і асветная дзейнасць, а „Ніва” выходзіла такім тыражом, які сённяшнім выдаўцам можа толькі прысніцца. Устрывожаныя гэтым партыйна-дзяржаўныя ўлады рабілі ўсё, каб прытармазіць актыўнасць нацыянальных меншасцей і іх дзейнасць максімальна звесці да музейных памераў. І гэтае ім удалося.

Аднак сёння іншы час і адзінае, што можа тармазіць дзейнасць, гэта нястача грошай або адсутнасць ахвоты дзейнічаць. Гледзячы на гэтае пытанне вачыма звычайнага чалавека магу сказаць адно: на нашай тэрыторыі таварыствы, і беларускае, і ўкраінскае — мёртвыя. Не толькі штодзень, але і з нагоды святаў у вёсках не вядзецца дзейнасць. Нават калі ў Сямятычах арганізуецца беларускі ці ўкраінскі канцэрт, то ніхто не паклапоціцца, каб афішы развесіць па навакольных вёсках. А, напрыклад, у Гайнаўскім павеце таксія плакаты ў вёсках я бачыў. Ці апрача канцэрта нельга часам сарганізаць цікавую сустрэчу або лекцыю? Атрымоўваецца, што наша адчуванне іншасці патрэбнае толькі ў час чарговых выбараў, а штодзень мусім самі даваць сабе рады.

Добра, што хаця Радыё Беласток кожны дзень 15 хвілін вяшчае аб нашых справах. Для многіх людзей, калі ўпала чытальніцтва, гэта адзіны кантакт з беларускай тэматыкай.

**М. Ц.**

## Запрашэнні, выстаўкі...

Вясковая святліца ў Старым Ляўкове (Нараўчанская гміна) запрашае на заняткі разблення ў гліне ў панядзелкі і серады ад 15 гадзіны. Могуць прыходзіць дзеці, моладзь і старэйшыя. Заняткі павядзе вопытная інструктарка скульптуры Вольга Максімюк з Новага Ляўкова.

* * *

12 снежня г.г. у 15 гадзін у галерэі „Гайна” ў Музеі і асяродку беларускай культуры ў Гайнаўцы па вул. 3 Мая, 42, адкрыта будзе выстаўка мастацкай самадзейнасці жыхароў Гайнаўшчыны. Экспазіцыю можна будзе глядзець да 31 студзеня 2005 года. Наведвальнікі выставы атрымаюць буклет пра творчых дасягненні творцаў-аматараў з Гайнаўскага павета.

* * *

З нагоды 100 гадавіны існавання Саюза польскага настаўніцтва Праўленне аддзела СПН у Міхалове аб’яўляе конкурс на ўспаміны настаўнікаў, працуючых прафесійна ў перыяд 1980 — 2000 гады. Конкурсныя працы трэба дасылаць да канца гэтага года на адрас: Zarząd Oddziału Związku Nauczycielstwa Polskiego, 16-050 Michałowo, ul. H. Sienkiewicza 21.

* * *

Белавежскі нацыянальны парк запрашае агледзець цікавую фатаграфічную выставу „Нацыянальныя паркі” ў белавежскім Прыродазнаўчым лясным музеі БНП (Палацавы парк) з 9 па 16 гадзіну.

* * *

Гайнаўскі дом культуры (вул. Беластоцкая, 2) запрашае агледзець выстаўку карцін Тамаша Тышкевіча і Андрэя Болтрыка, якая будзе працаваць да 31 снежня г.г. у галерэі ГДК. **(мох)**

## Калі цёмна — не выходзь!

Ужо мінуў месяц, як я тэлефанічна заявіў электраманцёрам у Нарве, што ў вёсцы Бялкі на стаўбе н-р 8 ледзь свеціцца лямпачка вулічнага асвятлення і прытым небяспечна шуміць. Сказаў таксама, што ў нашай вёсцы праводзяць водапровод і вуліца раскапаная. А за маёй сядзібай праходзіць палявая дарога і крыжуецца з вуліцай. Я проста апасаюся, каб тут не здарыўся нейкі нешчаслівы выпадак, калі цёмна на вуліцы. Пачуў у трубцы вось такі адказ: „Калі фірма „Тэхносан” пракладае ў вас водапровод, дык яна абавязана абяспечыць работу так, каб не здарыўся нешчаслівы выпадак. А калі цёмна на вуліцы, то не выходзь, каб сабе вока не выкалаў”.

Пазваніў я потым войту Нараўскай гміны Якубу Садоўскаму ў гэтай справе. Войт прасіў электраманцёраў, каб памянялі лямпачку на слупе. На жаль, да гэтай пары ніхто гэтага не зрабіў. Надалей цёмна на вуліцы. Вось, якія ў нас працаўнікі ды і няма куды на іх паскардзіцца. Электраманцёр — пан на ўсю гміну і яму нічога не скажы!

**Мікалай Лук'янюк**

## Патомкі абаронцаў Порт-Артура

*Паважаная рэдакцыя!*

З вялікай цікавасцю пазнаёміўся я з газетай „Ніва”. Матэрыялы ў ёй падаюцца ў вельмі цікавы для чытача спосаб. Я з’яўляюся членам Руху ў падтрымку флоту, займаюся пошукамі месцаў пахавання ўдзельнікаў руска-японскай вайны 1904-1905 гадоў. У той далёкай вайне ў Рускім флоце кожны дзесяты быў беларус або паляк. Толькі на самой Брэстчыне знайшлося нямала ўдзельнікаў і іх жывых патомкаў Цусімскага марскога бою і абароны Порт-Артура. Магчыма, што і ў Беластоку, і ў Падляшскім ваяводстве ёсць таксама такія магілы і жывуць патомкі ўдзельнікаў падзей стогадовай даўнасці.

Весткі пра магілы ўдзельнікаў руска-японскай вайны і адрасы жывучых цяпер іх патомкаў прашу дасылаць на мой адрас. Рэзультаты пошукаў апублікуем у сродках масавай інфармацыі да 100-й гадавіны Цусімскага бою.

*Валерый Адамянц-Пад’якоў*
*224011 Брэст*
*вул. Луцкая 14 кв. 152*
*хатні тэл. 43-53-97*

## Ці гэта справядліва?

Міністр Ежы Гаўзнер рашыў, што коштам старэч і інвалідаў можна палатаць дзіру ў бюджэце. Таму прапанаваў пераацэнку пенсіяў праводзіць кожныя два гады. Значыць, у наступным годзе не атрымаем нават ломанага граша. Але не ўсіх справа тычыцца. Як сказалі па тэлебачанні, былыя працаўнікі судоў і пракуратуры атрымаюць у наступным годзе падбаўку ў 300 зл. у месяц. **(ус)**

зорка
для дзяцей і моладзі



Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

### *Сняжынка*

*Упала сняжынка*
*На шчоку Ірынкі —*
*Адразу ж растала,*
*Слязінкаю стала.*
*Смяецца Ірынка,*
*Плача сняжынка...*

**Алена Кобец-Філмонава**

### *Зіма*

*Сёння першы дзень зімы.*
*І сняжынкі ловім мы.*
*А сняжынкі — жартаўніцы:*
*На руках адна вадзіца.*

**Ніна Галіноўская**

### *Мурка*

*Мурка скочыла за дзверы,*
*Твар спалоханы ў Веры —*
*На дварэ стаіць зіма,*
*У кошкі боцікаў няма...*

**Тадзіяна Кляшторная**

### *Зімовая загадка*

*У якой пярыне*
*зайчык не прастыне?*
*Ля якой падушкі*
*ён пагрэе вушкі?*

**Данута Бічэль-Загнетава**



Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

*Вучні і настаўнікі са школы ў Храбалах*

# Свята з восеньскім вершам

Хоць за акном снег ды холад, у школе ў Храбалах адчуваліся восеньскія колеры і цеплыня. Гэта з-за барвовых малюнкаў, якімі дзеці ўпрыгожылі сцэну. З другога боку — нашы конкурснікі вельмі перажывалі выступленне. Гэта з-за дэкламатарскага конкурсу „Восень у паэзіі".

Гэтае свята паэзіі наладзілі 23 лістапада г.г.

— Наш конкурс пра ўсе поры года. Адзначаем восень, зіму, вясну, лета, — кажа Валянціна Гаўрылюк, дырэктарка школы.

З гэтага года свята мае польска-беларускі характар. Значыць, дэкламатары выступаюць і па-беларуску, і па-польску (год таму дэкламавалі толькі па-польску). Часта адны і тыя ж самыя дзеці дэкламавалі па два вершыкі на дзвюх мовах.

Валянціна Гаўрылюк: — Чаму падтрымоўваем мастацтва дэкламацыі? У нас многа поспехаў у гэтай справе. Нядаўна, храбалоўскія вучні выступалі ў „Паэтычным трохгалоссі". Маем лаўрэатаў цэнтральнага конкурсу „Роднае слова".

Школа ў Храбалах немнагалікая — усяго 70 вучняў (на беларускую мову ходзіць кожны трэці вучань). Даязджаюць яны з дзесяці навакольных вёсак. Пасля ідуць у гімназію ў Аўгустова або Бельск.

Школа дасягнула найлепшых вынікаў у спорце — у кросавых бегах Храбалы былі першыя ў гміне Бельск. Заняткі па фізкультуры вядзе Мікола Хіліманюк.

З верасня ў школе працуе новая настаўніца беларускай мовы — Ева Каральчук.

— Усе вучні з шостага класа, — адзначае спадарыня Ева, — рыхтуюцца да прадметнага конкурсу па беларускай мове. Рыхтуюцца таксама да дэкламатарскага конкурсу „Роднае слова". У планах — паездка ў студзіводскі Музей малой айчыны Дарафея Фіёніка.

## *Лаўрэаты*

Я мела гонар разам з настаўніцамі Іааннай Пшыбыш, Агнешкай Грыгарук і Евай Каральчук працаваць у конкурснай камісіі. Трэба адзначыць, што самыя цікавыя дэкламацыі атрымаліся ў дзяцей, якія спрабавалі сваіх здольнасцей на дзвюх мовах. Калі ідзе пра падборку беларускіх твораў, дык першае месца належыць Віктару Шведу.

**Вось прозвішчы пераможцаў у катэгорыі І-ІІІ класаў:**

І месца — Моніка Гліва,

ІІ месца — Кацярына Гліва і Пятрусь Мордань,

ІІІ месца — Паўліна Федарук і Анна Багінская.

Вылучэнні: Караліна Барута, Паўліна Кірылюк, Кацярына Бядрыцкая і Матэвуш Іванюк.

**У катэгорыі IV-VI класаў:**

І месца — Іаанна Каршук,

ІІ месца — Альжбета Каршук, Паўліна Талочка,

ІІІ месца — Кацярына Талочка.

Вылучэнне: Адрыян Жэпнеўскі.

* * *

Як бачым, у школе тры моцныя сямейна-дэкламатарскія дуэты: сёстры Ася і Эля Каршук з Храбалоў, Моніка і Кася Гліва з Храбалоў ды Паўліна і Кася Талочка з Плёсак. Усе лаўрэаты атрымалі дыпломы і кніжкі (тут, на жаль, не хапіла беларускіх дыпломаў і кніжак), а ўсе іншыя ўдзельнікі — гучныя апладысменты.

На свята з восеньскім вершам прыйшлі ўсе вучні і працаўнікі школы.

**Зорка**

# Боцікі паўночныя

(працяг; пачатак у 47 нумары)

Калі праміпуў месяц, пані сама прыйшла ў сад, каб паглядзець на абяцанае дзіва. Гальяш моўчкі пакланіўся і павёў гаспадыню пад засень яблыняў. І пані Караліна не стрымала ўздыху: альтанка ў выглядзе сэрца, уся аплеценая ружамі, як чароўны куфэрак, уздымалася над пышным кілімам кветак, і на тым кіліме можна было прачытаць прыгожа выпісанае імя: „Караліна”. Многа там, кажуць, было яшчэ дзівосаў, але чаму пані выйшла з саду хуткім крокам, і шчокі яе ружавелі, як ніколі — не ведаў ніхто.

Пляткарылі, быццам нехта падгледзеў, як у альтанцы злучыліся на імгненне дзве постаці — але хто мог даць веры? Хіба ільдзяная каралева магла цалавацца з прыгонным садоўнікам?

Праз гадзіну Гальяша знайшлі ў той самай альтанцы — сядзеў, задуменны і маўклівы. Чаму ён не ўцякаў? Бо шукалі яго, каб выканаць страшны загад пані. Садоўнік мусіў назаўсёды застацца ў той альтанцы. Сцерты з жыцця, як брудная пляма з чысцюткага туфліка. Пан быў у ад’ездзе, і не было каму заступіцца. Дый Гальяш нібыта не жадаў заступніцтва. Ён нічога не прамовіў, пакуль яго прывязвалі да калоны ў альтанцы. І потым, наступныя дні, калі ніхто не смеў наблізіцца да панскага саду, адтуль не даносілася ані стогнаў, ані крыкаў... Кажуць, пані гэтыя дні таксама не выходзіла са свайго пакоя. Бачылі, як яна ўвесь час стаіць перад акном, за якім ззялі ружы і цямнела лісце бэзу, і ўглядаецца туды, дзе ў моры зеляніны і кветак памірае малады садоўнік.

А праз тыдзень зашаргаталі пілы, застукала сякера... Сад знікаў. А пані, усё гэткая ж гожая, спакойная і гордая, у белым касцюме, у капялюшыку з бухматымі пер’ямі, садзілася ў карэту. І тут жа выскачыла з яе з жахлівым крыкам — а прычына была смешная: у карэце ляжала трохі прывялая кветка ружы. Але пані паводзілася, быццам спаткала гадзюку. Ступіла на сцяжынку — зноў крык: ля дарожкі, між раўнютка падрэзаных травінак, стаілася маленькая маргарытка...

(заканчэнне будзе)

*Людміла Рублеўская*

# Польска-беларуская крыжаванка № 49

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку”. Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.




**Адказ на крыжаванку н-р 45:** Пол, лапа, самалёт, Рым, сава, шлях, Орша, аклад, каробка, яд. Сок, марш, мыла, хамяк, хлеб, лёс, тата, вока, падарак, лістапад.

Узнагароды — аўтаручкі — выйгралі: **Юстына Грыгарук** з Гайнаўкі, **Альжбета Антанюк** з Арэшкава, **Аляксандра і Уршуля Нікачукі** з Гарадзіска, **Ася Іванчук** з Градочна, **Ева Анапюк** з Нарвы, **Тамаш Парфянюк** з Чаромхі, **Якуб Сухадола** з Нараўкі, **Аня Савіцкая** са Свінароя, **Ася Казёл** з Гарадка, **Эвеліна Гайко, Дам’ян Рутчук** і **Аня Сілеванюк** з Бельска-Падляшскага, **Паўліна Мялешка** з Дубін. Віншуем! Узнагароды можна ўзяць у рэдакцыі „Ніва”, або чакаць іх у сваёй школе.




*Іграе Гарадок*

# Спяваю ў „Знічцы”

Мяне завуць Бася Трафімюк. Я вучаніца І „ц” класа Гайнаўскага белліцэя. Хачу сказаць некалькі слоў пра маю новую школу, а таксама ўспомніць старую.

Белліцэй спачатку здаўся мне вельмі суровым, але пасля двух месяцаў вучобы я магу спакойна сказаць, што за ніякія скарбы не хацела б памяняць школу. Калі параўнаць маю старую школу з новай, дык гэтак як параўнаць „трабант” з „цірам”. Аднак я наогул вельмі міла ўспамінаю гады вучобы ў Дубічах-Царкоўных.

Хачу сказаць, што ў белліцэі вельмі прыемная атмасфера. Я адчуваю сябе як у сваёй другой хаце. Мой клас — гэта 30 сяброўак і 1 сябар (пры нагодзе я хачу іх сардэчна прывітаць!). Я заўсёды магу з імі пагутарыць, а часам нават і пасварыцца. Словам, усё о-кей!

Я запісалася ў школьны калектыў „Знічка”. Нас 15 дзяўчат і ўва ўсіх прыгожыя галасы. Мы вывучаем песні пра шчаслівае або трагічнае каханне. Калі я запісалася ў калектыў, то думала, што ніколі не навучуся „варушыцца” на сцэне. Ёсць такая песня „Рэкрут”, дзе трэба, так сказаць, затанчыць. І я аніяк не магу гэтага навучыцца. Дзяўчаты гавораць, што калісьці атрымаецца, але ці так будзе? Папраўдзе, то слабая з мяне танцорка!

Навука даецца мне не найгорш (магло б быць, праўда, лепш). Я вельмі задаволена выбарам школы, бо тут магу спакойна гаварыць па-свойму і кожны мяне зразумее.

Хачу падзякаваць маім настаўнікам з Дубіч-Царкоўных за тое, што так добра мяне падрыхтавалі ў белліцэй. Асабліва дзякую настаўніцы Галіне Трашчотка, якая адкрыла ў мяне артыстычныя здольнасці. Думаю, што дзякуючы гэтаму я не загублюся ў свеце.

*Бася Трафімюк („Варка”)*

**Час рыцараў**

# Меч рыцара

Ці можаш уявіць сабе рыцара без мяча і зброі? Напэўна, не! Або без каня ў каштоўнай, бліскучай вупражы.

Як вядома, рыцары прыдумвалі нават імёны сваім мячам. Пра многія з іх узніклі міфы і легенды. Меч *Balisarda* перасякаў усё — нават зачараванае. Меч *Excalibur* тырчэў у скале пакуль не дастаў яго прававі́ты кароль Англіі. Меч *Angurvadel* прамяніў у час вайны, а ў мірны час рабіўся матовым.

Памяць пра ўсе вышэйзгаданыя мячы захавалася ў літаратурных творах, ды цяжка сказаць ці існавалі яны ў сапраўднасці. Вядома, аднак, што з цягам часу абмундзіраванне рыцара стала скандальна каштоўным. Не ўсе гермкі маглі купіць даспехі і з-за гэтага яны пакідалі намер змагацца за пасвячэнне ў рыцары.

(працяг будзе)

*Зорка*

# Вершы Віктара Шведа

## Цікавыя пытанні

*— Чаму твой жывот як бачок,*
*Скажы, мая мілая, матка?*
*— Дык ведай аб гэтым, сынок,*
*Нашу ў ім малое дзіцятка.*

*Пытанне сынка зноў гняце,*
*І ён запытаў надта смела:*
*— Дзіця маеш у жываце,*
*Чаму ж ты яго, мама, з’ела?*

## Не месіцца ў роціку мыла

*Матуля доню сварыла,*
*Якая сядзіць доўга ў ваннай:*
*— Чаму ты зубоў не памыла,*
*Зубы мыць трэба старанна.*

*Адказвае маме Людміла*
*З вялікім сумам у вочках:*
*— Не месіцца ў роціку мыла,*
*Таму не памыла зубочкаў.*

# Юбіляры ў новых строях




Фота МІКОЛЫ ВАЎРАНЮКА

У пятніцу, 19 лістапада, Бельскі дом культуры запоўніўся паклоннікамі хору „Васілёчкі”, якія адзначалі саракагадовы юбілей. У госці да юбіляраў прыехалі прадстаўнікі міністэрскіх, ваяводскіх і мясцовых улад ды калектывы „Цаглінкі” з Ляўкова і „Зорка” з Беластока. Вядучая канцэрт сакратар ГП БГКТ Валянціна Ласкевіч, якая калісьці сама спявала ў хоры, у перапынках паміж паасобнымі нумарамі праграмы расказала публіцы гісторыю калектыву.

Калі пасля першай часткі канцэрта „Васілёчкі” сышлі са сцэны, публіку забаўлялі калектывы „Цаглінкі” і „Зорка”. Другі ўваход калектыву на эстраду прыцягнуў увагу гледачоў новымі строямі і песняй „Васілёчак — сіні цвет” музычнага кіраўніка хору Мікалая Мяжэннага, спецыяльна напісаную да юбілею. Новыя касцюмы гэта таксама юбілейны падарунак Міністэрства культуры (10 тыс. зл.), бурмістра Бельска-Падляшскага (8,5 тыс. зл.) і Беларускага грамадска-культурнага таварыства (8,5 тыс. зл.). Строі былі заказаны ў Мінску. Тэрміноваму іх выкананню пасадзейнічаў пасол РБ Павел Латушка, а асабіста прывёз іх у Бельск консул Вадзім Палякоў.

З нагоды юбілею хору і паасобным спевакам былі прысвоены ўзнагароды. За заслугі ў прапагандаванні фальклору Падляшша Залаты крыж заслугі атрымала Ірына Астапчук, а Сярэбраны — Ніна Бялецкая і Галена Пашкоўская. Медалі ўручыў віцэ-ваявода Ежы Паўяновіч.

Міністр культуры адзнакай „Заслужаны дзеяч культуры” ўзнагародзіў Галіну Данілюк, Надзею Федаровіч і Уладзіміра Весялоўскага, а дыпломамі за асаблівыя заслугі ў распаўсюджванні культуры — Еўдакію Навакоўскую і Мікалая Мяжэннага. Фінансавую ўзнагароду памерам 10 тысяч злотых міністр прызначыў калектыву на ўборы. Міністэрскія ўзнагароды ўручыў Лешак Кілён — начальнік у Дэпартаменце супрацоўніцтва з самаўрадамі і прапагандавання культуры. Зачытаў ён таксама прывітальны адрас віцэ-міністра Мацея Клімчака, у якім, між іншым, пішацца: „Шматгадовая дзейнасць хору „Васілёчкі” прычыняецца да прэзентацыі лепшых дасягненняў мастацкай самадзейнасці, даючы гледачам незабыўныя эстэтычныя ўражанні ды супольную забаву і радасць”.

Бурмістр Бельска Яўген Беразавец не толькі павіншаваў харыстаў, але, апрача 8,5 тыс. зл. ад Рады горада прызначаных на ўборы, дадаткова перадаў хору 2 000 зл. ды ўручыў віншавальную грамату кожнаму ўдзельніку хору.

Затым віншаванні і падаркі перадалі сенатар Сяргей Плева і віцэ-ваявода Ежы Паўяновіч, а консул Вадзім Палякоў зачытаў віншавальны ліст ад амбасадара Паўла Латушкі і паведаміў, што хор узнагароджаны Ганаровымі граматамі Міністэрства культуры РБ і Камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры Савеце Міністраў РБ. Старшыня Галоўнага праўлення БГКТ Ян Сычэўскі віншуючы паабяцаў, што БГКТ будзе часта запрашаць „Васілёчкі” на канцэрты. Дырэктар Дэпартамента адукацыі і культуры Маршалкоўскай управы Галіна Вышкоўская зачытала ліст, у якім маршалак Януш Кшыжэўскі адзначыў, што хор спявае, каб „захаваць ад забыцця тое, што ў народнай культуры самае каштоўнае: традыцыю, веру бацькоў, абрады і штодзённыя звычаі і адначасна вялікую радасць ад супольных спеваў надта прыгожых і поўных мудрасці беларускіх песень, якія з’яўляюцца пастаянным элементам культурнага краявіду Падляшша”.

Старшыня Рады горада Пётр Кандрацюк падзякаваў „Васілёчкам” за прамоцыю горада і прыгадаў, што хор — аднагодак гурту „Ролінг Стоўнз”, які таксама яшчэ спявае. А бельскі староста Славамір Снарскі і старшыня Рады павета Уладыслаў Ягела пажадалі сустрэцца на залатым юбілеі, калі „Васілёчкі” будуць спяваць, а „Ролінг Стоўнз” ужо не.

„Васілёчкі” павіншавалі таксама віцэ-дырэктар Ваяводскага асяродка анімацыі культуры Барбара Пахольская, войт Бельскай гміны Яўгенія Асташэвіч, дырэктар БДК Сяргей Лукашук, рэдакцыя „Нівы”, дэлегацыі калектыву „Крыніца” з Беластока, хору Польскай нацыянальнай песні БДК, мясцовага духавога аркестра, „Маланкі”, „Курантаў”, „Цаглінак”, хору Гайнаўскага дома культуры. Віншаванні даслалі Тадэвуш Стружэцкі — начальнік дэпартамента ўстаноў культуры Міністэрства культуры РБ, калектыў „Расспяваны Гарадок”, жыхары Бандароў, Віктар Бура з Гайнаўкі, Фонд „Царкоўная музыка” ды бельскае аддзяленне Саюза пенсіянераў.

На заканчэнне канцэрта публіка праспявала юбілярам „Многае лета”.

**Віталь Луба**

# Статуя ў Чаромсе



Фота МАЦЕЯ ХАЛАДОЎСКАГА

Барбара Кузуб-Самасюк, арганізатарка мерапрыемстваў „З вясковага панадворка”, заснавальніца фалькавага ансамбля „Чарамшына” з Чаромхі апынулася ў тройцы сёлета ўзнагароджаных статуяй падляшскага маршалка ў галіне мастацкай творчасці, распаўсюджвання і аховы культуры.

Апроч яе спецыяльна створаная камісія пад кіраўніцтвам журналіста культурнай рэдакцыі Радыё Беласток, паэта Веслава Шыманскага, ушанавала кс. Вітальда Нагурскага з Тыкоціна і Веслава Яніцкага, стваральніка радыёсагі „На Млынавай вуліцы” ды супрацоўніка легендарнага „Натуральнага тэатра”. Агулам заяўлены быў 21 кандыдат.

Барбару Кузуб-Самасюк вылучылі за папулярызацыю рэгіянальнай народнай культуры ў краіне і па-за межамі. Урачыстасць уручэння статуй (і канвертаў з сямю тысячамі злотых) праводзіліся ў тыкоцінскім „Алюмнаце”. Прынялі ў ёй удзел амаль усе найважнейшыя асобы адказныя ў рэгіёне за культуру, сярод іх — Ян Сычэўскі, член падляшскай управы і віцэ-ваявода Ежы Паўяновіч.

— У час, калі царыць музыка поп, нялёгка спяваць на гаворцы свае меншасныя песні, — сказала ўсхваляваная лаўрэатка, якая спявае ды іграе на акардэоне ў адзінаццацігадовай „Чарамшыне”. Прысутны на ўрачыстасці войт Чаромхаўскай гміны Міхал Врублеўскі прызнаўся „Ніве”:

— Мы вельмі ганарымся гэтай узнагародай. Ушанавалі гэтым самым і Чаромху, наш лакальны патрыятызм.

Маршалак Януш Кшыжэўскі падкрэсліў, што галоўным крытэрыем назначэння ўзнагарод былі „творчае адкрыццё, прамацыйная каштоўнасць рэгіёна і каштоўнасці, якія раўняюцца выдатным агульнакраёвым дасягненням”. Выкарыстаў ён нагоду, каб падзяліцца заўвагамі наконт шырока ўяўленай культурнай палітыкі:

— Ва ўмовах рыначнай эканомікі і канкурэнтнасці неабходна ўтрымаць разумны мецэнат. Важны шырокі доступ людзей да культуры, гэта яе місія.

Прытым зазначыў:

— Дырэктар культурнай установы гэта перш за ўсё менеджэр, які патрапіць умела карыстацца пазабюджэтнымі сродкамі. Трэба, аднак, асцерагацца пералічвання твораў культуры на грашакі. Трэба супраціўляцца спробам таннага цэнзуравання твораў мастацтва і пераацэнкай іх каштоўнасцей.

Дадаў:

— Найпершая каштоўнасць гэта дзейнасць няўрадавых асацыяцый і арганізацый культуры, якія мы падтрымлівалі і гэтак будзе ў наступным годзе.

І, фактычна, можна ў гэтыя словы паверыць, калі пералістаць праект бюджэту, тэкст якога быў уручаны падляшскім радным у час апошняй сесіі Падляшскага сейміка. Мэтавую датацыю з бюджэту на фінансаванне ці дафінансаванне дагаворных задач на рэалізацыю фондам запланавана амаль удвая большую чым леташняя (было 65 тыс. зл., цяпер — 120 тыс. зл.). Павялічана таксама сума датацый згуртаванням (з 60 тыс. зл. да 100 тыс. зл.). Прытым, аднак, што ў бюджэце на наступны год управа намервaецца зменшыць квоты назначаныя падлеглым сабе ўстановам, такім як Беластоцкая філармонія, Драматычны тэатр, Падляшскі музей ці Ваяводская бібліятэка. Як будзе канчаткова, невядома, паколькі невядомыя яшчэ сумы, якія перадасць ведамства культуры. У падляшскім бюджэце, аднак, не прадбачваецца ні граша на рэалізацыю інвестыцыйных задач. Таму не здзівіла заўвага маршалка ў Тыкоціне:

— Новыя крыніцы фінансавання культуры дае Еўрасаюз.

Сёлетняе ўручэнне ўзнагарод маршалка было ўжо пятым. У ліку ўзнагароджаных былі м.інш. фатаграфік Віктар Волкаў, стваральнік Фестывалю царкоўнай музыкі ў Гайнаўцы Мікола Бушко і мастак Яраслаў Пэршка. Сёлета эпіграфам былі словы Фёдара Дастаеўскага: „Дазвольма мастацтву ісці сваёй дарогай, з верай, што не сыдзе яно на бездарожжа”. Цікава, як можна яго разумець у кантэксце пастаяннай фінансавай мізэрноты ў культуры.

**Мацей Халадоўскі**

**Родам з Беласточчыны**

# Маршал Васіль Сакалоўскі



*Васіль Сакалоўскі, 1928 г.*

Імя маршала Савецкага Саюза і героя Савецкага Саюза Васіля Сакалоўскага на Беласточчыне незаслужана забыта. Ды і хто з беларускай моладзі пра яго наогул сёння што ведае? Практычна нічога. Тым не менш беларус Васіль Сакалоўскі заслужыў памяці ў сваіх нашчадкаў, пра яго мы павінны згадваць часцей і памятаць. Ды і не ўсім у той час давалі званні герояў і маршалаў. Хаця не ўсё так гладка складвалася і ў вайскоўца-беларуса, як пра гэта пісалі ў свой час савецкая прэса і кнігі.

Васіль Сакалоўскі нарадзіўся ў вёсцы Козлікі Заблудаўскай воласці Беластоцкага павета ў 1897 годзе ў сям'і беларускага селяніна-бедняка. Спачатку дома скончыў двухкласную настаўніцкую школу і пэўны час працаваў настаўнікам у вясковай школе. Калі пачалася першая сусветная вайна сям'я Сакалоўскіх выехала ў бежанства ў Пскоўскую вобласць Расіі.

У 1918 годзе Васіль Сакалоўскі пасля заканчэння настаўніцкай семінарыі марыў працаваць настаўнікам, але ў Расіі адбыўся кастрычніцкі пераварот і, каб не памерці з голаду, юнак добраахвотнікам уступіў у Чырвоную Армію і быў накіраваны на першыя Маскоўскія ваенна-інструктарскія курсы. Пасля курсаў зноў працягваў вучобу ў Акадэміі Генеральнага штаба. І, вядома ж, ваяваў. Спачатку на Усходнім фронце, пасля на Каўказскім, дзе быў прызначаны начальнікам штаба 32-й стралковай дывізіі. Дывізія гэта ўстанаўлівала савецкую ўладу ў Азербайджане і ў Дагестане.

У 1924 годзе Васіль Сакалоўскі пераводзіцца ў Маскоўскую ваенную акругу і прызначаецца на пасаду начальніка штаба стралковай дывізіі. Свае службовыя абавязкі Сакалоўскі выконвае паспяхова і праз два гады становіцца начальнікам штаба корпуса спачатку ў Паўночна-Каўказскай, а затым Беларускай ваеннай акрузе. На гэтых пасадах наш зямляк працаваў да 1930 года з невялікімі перапынкамі для вучобы на вышэйшых акадэмічных курсах. Затым Васіля Сакалоўскага пераводзяць на камандную работу, дзе на працягу пяці гадоў ён паспяхова камандуе стралковай дывізіяй Беларускай ваеннай акругі.

Калі пачалася вайна, Васіль Сакалоўскі працаваў на пасадзе намесніка начальніка Генеральнага штаба па арганізацыйна-мабілізацыйных пытаннях савецкіх войскаў. Але ў ліпені 1941 года яго прызначаюць начальнікам штаба Заходняга фронту, войскі якога прыкрывалі найбольш важныя і небяспечныя стратэгічныя раёны першага перыяду вайны.

Талент Васіля Сакалоўскага, як выдатнага военачальніка, праявіўся ў бітве пад Масквою. А ў 1942 годзе яму было прысвоена званне генерала-палкоўніка.

У лютым 1943 года генерал-палкоўнік Сакалоўскі быў зацверджаны на пасаду камандуючага войскамі Заходняга фронту. На працягу лютага і сакавіка Заходні фронт пад яго камандаваннем паспяхова правёў аперацыю па ліквідацыі Ржэўска-Вяземскага плацдарма нямецка-фашысцкіх войскаў. А летам войскі Заходняга фронту пад камандаваннем Васіля Сакалоўскага (ужо генерала арміі) выдатна правялі яшчэ дзве аперацыі — Арлоўскую ва ўзаемадзеянні з Бранскім і Цэнтральным франтамі і Смаленскую ва ўзаемадзеянні з Калінінскім фронтам. Салдаты яго фронту вызвалілі Смаленшчыну, пасля Віцебск і іншыя гарады Беларусі.

У 1944 годзе наш зямляк займаў пасаду начальніка штаба І Украінскага фронту, а пасля быў намеснікам камандуючага войскамі І Беларускага фронту. Яго воіны вызвалялі родную Беларусь, Украіну, Польшчу, прымалі ўдзел у падрыхтоўцы Берлінскай аперацыі. У 1945 годзе



*Васіль Сакалоўскі, 1946 г.*

Васіль Сакалоўскі атрымаў званне героя Савецкага Саюза, а праз год яму было прысвоена званне маршала Савецкага Саюза.

У пасляваенныя гады маршал Васіль Сакалоўскі быў прызначаны галоўнакамандуючым групай савецкіх войск у Германіі і галоўнакамандуючым савецкай ваеннай адміністрацыі ў Германіі.

Пасля працаваў намеснікам міністра абароны СССР, быў генеральным інспектарам Групы генеральных інспектараў Міністэрства абароны СССР.

У апошнія гады свайго жыцця (памёр у 1968 годзе) Васіль Сакалоўскі шмат працаваў над развіццём савецкай ваеннай тэорыі, галоўным чынам у галіне стратэгіі, а таксама гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Ён часта выступаў у друку, пад яго кіраўніцтвам былі распрацаваны кнігі «Ваенная стратэгія», «Разгром нямецка-фашысцкіх войскаў пад Масквою» і іншыя. Плённа працаваў наш зямляк і пры напісанні шасцітомнай гісторыі Вялікай Айчыннай вайны Савецкага Саюза.

Памяць пра Васіля Сакалоўскага сёння ўшанавана ў Беларусі ў назве адной з вуліц Гродна. У горадзе над Нёманам устаноўлены і бюст военачальніку. Яго імя нададзена і Навачаркаскаму вышэйшаму ваенна-каманднаму вучылішчу сувязі ў Расіі.

Прачытаўшы гэтыя біяграфічныя радкі, можна падумаць, што лёс і кар'ера нашага земляка складваліся вельмі шчасліва і паспяхова. Але гэта зусім не так. Справа ў тым, што Васіль Данілавіч Сакалоўскі быў вельмі сціплым і цярплівым чалавекам. Ён нават мог шмат гадоў ужыцца з такой неардынарнаю асобаю, якім быў маршал Георгій Жукаў. Наогул, родныя дзеці мала што ведалі пра жыццё свайго бацькі, ды і той ніколі не любіў пра сябе расказваць. Калі адну з дачок маршала папрасілі на святкаванні яго 100-годдзя выступіць і расказаць пра бацьку, яна разгубілася. А вось унучкі Наталля Сінюк і Вольга Захаркіна ў апошні час агучылі цікавыя факты з біяграфіі свайго дзеда. „Георгій Жукаў, — успамінае Наталля, — мог накрычаць на майго дзеда ў прысутнасці афіцэраў і салдат, ён часта даводзіў Васіля Данілавіча да сардэчнага прыступу. Хаця дзед ніколі ў сваім жыцці не крычаў на падначаленых. Ён быў адзіным маршалам, які званіў па службовым тэлефоне, вітаўся і называў сваё прозвішча. Усе іншыя военачальнікі лічылі, што падначаленыя павінны былі пазнаваць маршалаў па голасе".

Другая ўнучка, Вольга, сказала, што «яе дзед у 1937 годзе ледзьве пазбегнуў рэпрэсій. І толькі дзякуючы жонцы Ганне Пятроўне, ён застаўся на волі. А справа была так. Смерч рэпрэсій у 1937 годзе пракаціўся па Уральскай ваеннай акрузе, дзе наш дзед быў начальнікам штаба. Аднойчы да іх прыходзіць супрацоўнік НКВД і кажа: „Товарищ Соколовский, к нам в органы поступило письмо, где вы обвиняетесь в том, что являетесь белопольским шпионом. В своей автобиографии вы преднамеренно скрыли факт, что в период Первой мировой войны служили офицером царской армии. Если завтра к утру вы не представите оправдательные документы, приходите на службу сразу же с личными вещами...". Як расказвала нам бабуля, для дзеда гэта было вялікай нечаканасцю і ўдарам. Дзед ніколі не служыў у царскай арміі, бо ў тыя гады ён вучыўся ў семінарыі. Ганна Пятроўна ўспомніла, што нейкія дакументы той пары зберагаюцца ў скураным партсігары. Пачалі шукаць. І адну паперку знайшлі, якая і выратавала яму жыццё. У даведцы было напісана, што старшы воінскі начальнік горада Невеля (там дзядуля вучыўся) вызваляе ад прызыву ў армію В. Д. Сакалоўскага да заканчэння вучобы ў настаўніцкай семінарыі. На другі дзень дзядуля паказаў афіцэру НКВД гэты дакумент. Той прачытаў і сказаў: „Хорошо. Вы свободны. Приступайте к работе"».

Такіх прыкладаў з жыцця нашага земляка можна прывесці шмат. Але прайшоўшы ўсе ліхалецці, беларус Васіль Сакалоўскі выстаяў, не скарыўся ні перад рэпрэсіямі і ні перад войнамі.

**Сяргей Чыгрын**

# *Трагічная акупацыя*

***Успаміны Дарыі ВІЛЬЧЫНСКАЙ з Пярэймы, народжанай у 1931 годзе ў Пяшчаніках.***

*У вайну мой тата быў солтысам у Пяшчаніках. Былі прыходзілі да яго немцы, дапытвалі, ці знае партызанаў, а ён адказваў, што не ведае. Перад расстрэлам Папоўкі забралі ўсю нашу сям'ю — бацьку, маці, сястру, паўтарагадовага брацікa і мяне — у Гарадок, завезлі нас ноччу самаходам і памясцілі ў хлеў. У суседні будынак прывезлі жыхароў Папоўкі. З нашай сям'і дапытвалі толькі тату. Білі яго і дамагаліся каб прызнаўся, а ён не прызнаваўся, бо нічога не ведаў. А нямецкі камісар вельмі люты быў, наб'юць тату і да нас адпускаюць. Прыходзіў з пабітымі і папухлымі рукамі. Мы яму рукі малаком абкладалі, якое нам нехта прынасіў, бо вады не было. Так нас трымалі мо з тыдзень.*

*Калі мелі ўжо біць, выклікалі тату: — Прашу выйсці солтыс з Пяшчанікаў!*

*Мы ўсё гэта бачылі і чулі. Людзі дол выкапалі. Спярша нашага тату пастрэлілі, а пасля і па папоўскіх застракаталі.*




*Як пабілі Папоўку, то нам дазволілі дадому вяртацца. Вярнуліся пяшком, бо з пустымі рукамі былі. А з нашай хаты за той час усё парасцягалі; і палатно, і ўсё. І невядома хто гэта зрабіў, і ніхто нічога нам не сказаў. Толькі дабытак астаўся, нехта дагледзаў.*

*Пазней хацелі яшчэ татавага брата расстраляць, але не чапалі. І мо пасля года сталі гаварыць, што і нас паб'юць. Тады мы знялі ў Гарадку хату і там начавалі, а на дзень у Пяшчанікі даязджалі; аж пакуль тыя злыдні не адышлі.*

*Пасля паўтара ці двух гадоў адкрылі магілу. У тата нічога не згніло, усё здарове было: кашуля, пояс. Труны ў вёску прывезлі. Мы свайго тату пахавалі асобна.*

*І брат мой у вайну загінуў. Пайшоў за суседа, чыгунку каля Дзернякова вартаваць. І ў Пяцідзесятніцу на досвітку ўзарвалі чыгунку, выбух вырваў яму галаву.*

***Запісаў Аляксандр Вярбіцкі***

*Першыя песні на беларускай мове пачалі з'яўляцца недзе падчас гвалтоўнай беларусізацыі насельніцтва пачатку 90-х гадоў...*

# http://pomidoroff.net

Практычна кожная паважаючая сябе зорка эстрады мае ўласны сайт у Інтэрнэце, часцяком нават некалькі. Беларускія музычныя выканаўцы тут не выключэнне, прыкладам чаму можа служыць сайт вядомага, у тым ліку і на Беласточчыне, рок-музыканта Аляксандра Памідорава. Каб у гэтым упэўніцца, дастаткова набраць на сваім камп'ютэры адрас у сусветнай павуціне http://pomidoroff.net.

Першае выяўленне, якое з'яўляецца на маніторы, досыць арыгінальнае. Пасярод суцэльнай чарнаты з нібыта падаючых літар складваецца назва сайта. Калі клікнуць на яе, то выходзім на галоўную старонку, якая таксама падае ўсю інфармацыю на чорным фоне. У верхнім левым вугле змешчаны невялікі фотаздымак сучасных беларускіх рок-музыкаў — Канановіча, Кораня, Быкава і Памідорава. Пад здымкам невялікі тэкст са словамі прывітання і, з правага боку, выхады да іншых рубрык сайта. „Пройдземся" па іх.

Першая рубрыка „Дыскаграфія". У ёй выявы дыскаў з песнямі вышэйзгаданых музыкантаў з невялікімі анатацыямі. Калі клікаць на выяўленні гэтых дыскаў, то яны з'яўляюцца ў большых памерах і з большым расповедам аб змесце. З гэтай інфармацыі мы можам даведацца калі дыск быў запісаны, якія творы ён змяшчае, хто непасрэдны выканаўца.

Рубрыка „Гісторыя" найбольш багатая па колькасці размешчанай інфармацыі. У трох главах вядзецца расповед пра ўзнікненне і развіццё сучаснай беларускамоўнай рок-музыкі і, зразумела, удзеле ў гэтым спадара Памідорава. Вось як ён узгадвае самы пачатак: „Першыя песні на беларускай мове пачалі з'яўляцца недзе падчас гвалтоўнай беларусізацыі насельніцтва пачатку 90-х гадоў, дакладней, у 1990. Вучыўся я тады ў Мінскім інстытуце культуры, і шмат кантактаваў з сябрамі з іншых ВНУ, што пачыналі стагнаць і часам лямантаваць ад пераводу, напрыклад, вывучэння вышэйшае матэматыкі ці юрыспрудэнцыі на мову".

Наступнай старонкай, дзе шмат чаго можна не толькі пачытаць але і паглядзець, ёсць рубрыка „Галерэя". Тут змешчаны цэлы фотаальбом вышэйзгаданых музыкантаў падчас іх выступленняў на розных канцэртах. Гэта „Басовішча" 2001-2002 гадоў, „Бардаўская восень" — 2000, 14 чэрвеня 2003 года і не зусім зразумелае „Рознае" з некалькімі фотаздымкамі. Трэба адзначыць, што ўсе фатаграфіі чорна-белыя, але іх можна паглядзець і ў каляровым варыянце. Для гэтага дастаткова клікнуць на кожную з іх і яны з'яўлюяцца ў павялічаным каляровым фармаце.

Старонка „Прэса" таксама дае поўнае ўяўленне аб гэтым сегменце беларускамоўнай эстрады. У рубрыцы падборка самых разнастайных нататак і артыкулаў, што тычацца Аляксандра Памідорава і ўвогуле беларускага рока. Прычым сабраныя матэрыялы з самых розных газет як беларуска-, так і рускамоўных.

Рэдкі сайт не можа абысціся без таго, што часцей за ўсё называецца „форумам". У Памідорава таксама ёсць такая старонка і называецца яна „Гасцёўня". Фанаты выканаўцы, ды і простыя інтэрнэтныя вандроўнікі даволі часта дасылаюць свае меркаванні па тых ці іншых пытаннях і час ад часу атрымліваюць адказ, калі не ад самога музыкі, так ад сабе падобных.

Падаецца, найбольшы інтарэс даны сайт выкліча ў тых, каго звычайна называюць меламанамі, ці, больш па-сучаснаму, фанамі.

**Уладзімір Лапцэвіч**

*Летась нашы тэнісісты для многіх сенсацыйна выйгралі Кубак Еўропы. Сёлета справы ідуць не так гладка...*

# Беларусь, беларусы...

### Майстры сталовай справы

Настольныя тэнісісткі Беларусі, адолеўшы венгерак, выйшлі на першае месца ў сваёй адборавай групе да фіналу чэмпіянату кантынента. Беларускі ўжо забяспечылі свой удзел у фінальнай частцы. Каб утрымацца на першай пазіцыі ў групе, цяпер ім дастаткова ў апошняй сустрэчы 6 студзеня 2005 года ў Мінску з любым лікам адолець аўтсайдэраў — зборную Літвы.

Фаварыткамі ў кваліфікацыйным турніры прэм'ер-дывізіёна ад пачатку была Венгрыя, адна з мацнейшых каманд Старога свету. Менавіта ёй у гасцях нашы прайгралі з сухім лікам — 0:3. Цяпер прыйшоў час рэваншу. Беларускі Вікторыя Паўловіч, Вераніка Паўловіч і Тацяна Кастраміна выступілі надзвычай пераканаўча — таксама 3:0. Беларусь і Венгрыя набралі па 9 пунктаў, але лепшая розніца па сетах у асабістых сустрэчах дазволіла нам стаць на першы радок. У Чэхіі — 7 ачкоў, у Літвы — 5. Варта пахваліць усіх нашых дзяўчат. Беларуская першая ракетка (дваццатая ў свеце) Вікторыя Паўловіч адолела сяміразовую чэмпіёнку Еўропы, знакамітую Чылу Баторфі — 3:1. Другая з сясцёр Вераніка Паўловіч саступала суперніцы 0:2, але здолела захапіць ініцыятыву і дамагчыся трох пераможных сетаў запар. А завяршыла справу дасведчаная Кастраміна, выйграўшы свой матч „пад нуль". Блізняты Паўловіч займаюцца пінг-понгам з самага дзяцінства. Найперш з імі апошнія семвосем гадоў звязаныя асноўныя надзеі айчынных заўзятараў. Цікава, што сёстры гуляюць у абсалютна адрознай манеры — Вікторыя тыповая „абаронца", а Вераніка дзеіць у наступальна-агрэсіўным стылі.

У беларускай мужчынскай дружыны даўно ёсць праблема моцнага трэцяга нумара. З першымі дзвюма ўсё зразумела — Уладзімір Самсонаў мацнейшы ас малой ракеткі ў Еўропе апошніх дзесяці год, высокі стабільны рэйтынг мае і экстра-майстар абароны Яўген Шчацінін. Цяпер на ролю асноўнага трэцяга зборніка прэтэндуе 21-гадовы Павал Платонаў.

Летась нашы тэнісісты для многіх сенсацыйна выйгралі Кубак Еўропы. Сёлета справы ідуць не так гладка. У адборавай групе да фіналу кантынентальнага чэмпіянату беларусы надзіва няўдала выступаюць у родных сценах. Так наша каманда ў першым коле саступіла дома палякам і аўстрыйцам. У апошнім туры ўдалося палепшыць становішча. Беларусь перамагла ў гасцях Польшчу — 3:0. Заўважым, праўда, што ў гаспадароў пляцоўкі не гулялі двух мацнейшых тэнісістаў — Люцыян Блашчык і Тамаш Кшашэўскі. Цяпер турнірная табліца мае наступны парадак: Польшча — 9 ачкоў, Аўстрыя — 8, Беларусь — 7, Венгрыя — 6. У апошнім туры 4 студзеня надыходзячага года Беларусь будзе прымаць мадзьяраў. Для таго, каб заняць трэцяе месца, якое таксама дае магчымасць працягваць змаганне, нашым трэба выйграць.

У індывідуальных спаборніцтвах сезон стаў для беларусаў „паласатым" — хапала і поспехаў, і правалаў. На афінскай алімпіядзе з-за жорсткай канкурэнцыі з боку заканадаўцаў пінг-понга азіятаў, ніхто з нашых не трапіў у паўфінал. З іншага боку сёлета Уладзімір Самсонаў (цяпер восьмая ракетка свету) выйграў адкрыты чэмпіянат Бразіліі. А Вікторыя Паўловіч стала чэмпіёнкай адкрытага першынства Даніі ў парным разрадзе. Так што ў настольным тэнісе беларусы маюць устойлівую рэпутацыю грозных суперніцаў.

**Уладзімір Хільмановіч**

# Падрыхтоўка Чацвёртага з'езда беларусаў свету

23 лістапада 2004 г. адбылося пасяджэнне Малой Рады МГА ЗБС „Бацькаўшчына", на якім было прынята рашэнне аб скліканні 16-17 ліпеня 2005 г. Чацвёртага з'езда беларусаў свету. На пасяджэнні абмеркаваныя прынцыповыя пытанні З'езда і абвешчаны пачатак працы па яго падрыхтоўцы. На З'ездзе чакаецца прысутнасць прадстаўнікоў беларускай дыяспары з больш чым 25 краін свету. Месцам правядзення З'езда абраны горад Мінск.

Абмеркаваўшы актуальныя пытанні беларускай сусветнай супольнасці, Малая Рада вызначыла асноўную тэму З'езда: „Дыяспара для Беларусі — Беларусь для дыяспары. Шляхі да кансалідацыі і развіцця нацыі". У межах З'езда запланаваны наступныя секцыі і круглыя сталы:

1) Месца Беларусі ў Еўропе;

2) Беларуская эміграцыя: змена пакаленняў;

3) Роля беларускай дыяспары ў дэмакратычных пераўтварэннях у Беларусі;

4) Перспектывы эканамічнага супрацоўніцтва: Беларусь — дыяспара;

5) Культура і адукацыя. Хада нацыянальна-культурнага адраджэння.

Рашэннем Малой Рады быў створаны Арганізацыйны камітэт па падрыхтоўцы і правядзенні Чацвёртага з'езда беларусаў свету. Старшынёй Аргкамітэта абраны прафесар Анатоль Грыцкевіч, сустаршынямі: акадэмік Радзім Гарэцкі, доктар Янка Запруднік, Старшыня Рады МГА ЗБС „Бацькаўшчына" Алена Макоўская, сябры Управы МГА ЗБС „Бацькаўшчына" Валеры Герасімаў і Барыс Стук.

Прызначаны каардынатары па падрыхтоўцы З'езда ў Польшчы, Расіі, Украіне, Літве, Латвіі, Эстоніі, краінах Цэнтральнай і Заходняй Еўропы, Аўстраліі, ЗША, Канадзе.

Інфармацыйны цэнтр МГА „ЗБС „Бацькаўшчына": тэл. 226-83-37, факс 289-31-94, zbsb@lingvo.minsk.by

# Сустрэчы пасла Беларусі

23 лістапада 2004 года адбылася сустрэча пасла Беларусі ў Польшчы Паўла Латушкі са старшынёй Вышэйшай кантрольнай палаты Польшчы Міраславам Секулай, у рамках якой быў прааналізаваны стан узаемадзеяння вышэйшых кантрольных службаў Беларусі і Польшчы.

Бакі выказалі задавальненне дынамікай і характарам супрацоўніцтва паміж Камітэтам дзяржаўнага кантролю Беларусі і Вышэйшай кантрольнай палатай Польшчы. У шэрагу апошніх сумесных мерапрыемстваў былі адзначаны стажыроўка супрацоўнікаў КДК Беларусі ў ВКП Польшчы, сустрэча кіраўнікоў Брэсцкага і Гродзенскага ўпраўленняў Камітэта дзяржкантролю з кіраўніцтвам дэлегатур ВКП у Любліне і Беластоку.

У ходзе сустрэчы была закранута сітуацыя, якая склалася вакол праверак польскімі кантрольнымі органамі ліцэяў з вывучэннем беларускай мовы і шэрагу арганізацый беларускай меншасці ў Польшчы.

*http://belembassy.org*




*Павел Латушка — пасол Рэспублікі Беларусь у Польшчы*

Да юбілею Гайнаўскага беларускага ліцэя

# Мае ўдачы і няўдачы



### Прымітыўная педагогіка

Я заўсёды шкадаваў маладых людзей, якія не карысталіся прывілеямі свайго юнацкага ўзросту. Мне здаецца, што аж так адмовіцца ад радасцяў маладога жыцця, як у прыведзеным прыкладзе, я не змог бы, відаць, зараскошны я. Мне больш даспадобы іншая крайнасць, з якой я таксама сустрэўся ў ліцэі.

На адзін з урокаў не з'явілася група вучняў абодвух полаў. Што за чорт? — занепакоіўся настаўнік, а хутка потым дырэктар і рэшта педсавета. Толькі што іх бачылі ў школе, і на першых уроках — і раптам прапалі пропадам сярод белага дня, як скрозь зямлю праваліліся.

Дырэкцыя і педсавет распачалі энергічныя пошукі, якія хаця і не адразу, але ўсё ж такі закончыліся поўным поспехам. Уся кампанія была накрыта ў жаночым туалеце, дзе яны, відаць, з-за адсутнасці яшчэ ў нашых школах банкетных кабінетаў, жыццярадасна трапезнічалі. Трапеза складалася з розных закусачных далікатэсаў пераканаўча запіваных спіртнымі далікатэсамі.

На грознае настаўніцкае пытанне: „Што за безабраззе тут адбываецца?!" — адзін з трапезнікаў выйшаў наперад і са стаіцкім спакоем ды асабістай годнасцю адказаў, што сёння свята і дзень яго ангела, якія ён, як любіцель традыцыі і веруючы чалавек, штогод з сябрамі адзначае. Бо як жа ж і не пачаставаць людзей, калі яго павіншавалі?..

Жыццё ў пасляваенны час не стаяла ў нас на месцы, а ўсё змянялася і змянялася. На жаль, не заўсёды на лепшае. Гэтыя змены найвыразней праслядзіць можна па зменах — як было ўжо сказана — прапорцый паміж паасобнымі групамі ліцэістаў паводле іх сацыяльнага паходжання. Гэта проста дарожная карта звышпаўвекавога нашага тут бытавання. Спачатку асноўная маса ліцэістаў была сялянскага, мужыцкага паходжання, потым сялянска-рабочага, рабоча-сялянскага, рабочага і ўрэшце з немалой дамешкай інтэлігенцкага.

У час санацыйнай Польшчы і нямецкай акупацыі нашы вёскі былі моцна перапоўнены, перанаселены, бо не было куды адыходзіць лішнім. Толькі ў пасляваенны час пачала шпарка развівацца прамысловасць, гарады і яны хутка ўсысалі ў сябе спачатку лішняе, а потым ужо і нялішняе сялянства. Многія адначасова жылі і працавалі і ў горадзе, і на вёсцы. Адсюль часта такая неразбяруха ў сацыяльным статусе нашых ліцэістаў. І так было амаль да канца Народнай Польшчы.

І ўсё ж такі, нягледзячы на такую нацыянальна-рэлігійную мешаніну ліцэйскай моладзі, ліцэю ўдавалася ствараць з іх працоўныя калектывы і дружную школьную сям'ю. Я проста не прыпамінаю, каб па гэтых прычынах узнікалі між імі нейкія непаразуменні ці канфлікты. Гэта была добрая, працавітая, „карная" моладзь. І добрыя, здысцыплінаваныя іх бацькі з яшчэ дзедаўскімі выхаваўчымі метадамі. Яны ўмелі пакорна выслухаць нас, настаўнікаў, насякнутых ужо новымі выхаваўча-педагагічнымі метадамі і назойліва прапаведаваўшых іх — і згадзіцца з імі. Але, канешне, больш верылі ў сваю педагогіку. Яны не баяліся сваіх дзяцей, як многія цяперашнія бацькі, і на розныя адмоўныя праявы сваіх дзяцей рэагавалі адразу і імпульсіўна. Часта надта імпульсіўна.

Дзесьці ў сярэдзіне шасцідзесятых гадоў моцна надакучыў мне сваімі нестандартнымі паводзінамі вучань майго класа. Мае прафілактычныя гутаркі выразных вынікаў не давалі. І я рашыў паклікаць яго бацькоў, жыхароў прыпушчанскай вёскі, і падзяліцца з імі сваёй няўдачай у падборцы выхаваўчага ключа да іх сына Валодзькі. З'явіўся ў школе бацька — невысокі, ціхі, мілы чалавек. Выслухаў мяне, перапрасіў за сына і сціпла запытаў:

— А вы маглі б яго сюды паклікаць? Можа мне ўдасца падабраць такі ключык? — дадаў.

Я паклікаў. Як толькі Валодзька пераступіў парог следчага пакоя, бацька проста быком кінуўся на яго з кулакамі:

— Я тобіэ, ёб твою мать, зараз твою скуору спушчу!

Чуць я вырваў беднае хлапчанё з бацькоўскіх спрацаваных і справядлівых ручак. Але ўспеў крыху абарваць Валодзька, ды і выхаваўцу яго ў гарачцы інтэнсіўнага выхаваўчага працэсу крыху дасталася.

І што вы думаеце, гэтая старая, здавалася б прымітыўная, выхаваўчая педагогіка памагла Валодзьку. І мне. Далей ужо большых клопатаў я з ім не меў. Не стаў ён праўда, як кажуць, анёлам, бо меў тое ў крыві, каб час ад часу скрыта зрабіць нейкае глупства. Што гэта яго работа, я проста па почырку пазнаваў. Але ў час следства ён датуль не прызнаваўся, пакуль я не прапанаваў яму:

— А можа, Валодзька, паклічам твайго татку, ён хутка разбярэцца вінаваты ты ці не?

Пасля такой прапановы Валодзька хутка мякчэў і да ўсяго прызнаваўся, благальна просячы аформіць справу без бацькі. І зноў на нейкі час меў я спакой.

Так і дацягнулі мы з ім да матуры, бо вучнем ён быў здольным…

**Васіль Сакоўскі**

На што разлічваць у новых умовах?

# Структурныя пенсіі

Апошнім часам многа гаворыцца аб структурных пенсіях, якія велічынёй у некалькі разоў могуць перавысіць невялікую сельскагаспадарчую пенсію. У Гайнаўскім павеце толькі 53 гаспадары выступілі ў Павятовае бюро Агенцтва мадэрнізацыі і пераўтварэння сельскай гаспадаркі з дакументамі на атрыманне структурных пенсій. Каб даведацца, што думаюць пра структурныя пенсіі сяляне, я наведаў жыхароў Збуча (Чыжоўская гміна). Солтыс Надзея Пліс і яе муж Уладзімір паінфармавалі, што лічаныя асобы ў іх вёсцы могуць хадайнічаць за атрыманне такой пенсіі.

— Калі б было больш гаспадароў узростам звыш 55 гадоў, якія яшчэ не перайшлі на пенсію КРУСу, то былі б ахвотныя пераходзіць на структурную пенсію. У нас многа старэйшых людзей і яны ўжо пенсіянеры. У нашай частцы вёскі толькі мы і сусед гаспадарым. У Збучы толькі 8 гаспадароў, у якіх больш поля. Яны бяруць поле ў арэнду ад пенсіянераў — выхадцаў з вёскі і таму ў нас няма аблагоў, — кажа Уладзімір Пліс. — Я яшчэ замалады на структурную пенсію.

Міхалу Раманюку трэба чакаць тры гады, каб перайсці на новую пенсію. У канцы дзевяностых гадоў выступіў ён з калгаса, які развальваўся з-за вялікіх даўгоў. Забраў ён сваю зямлю і распачаў індывідуальнае гаспадаранне.

— У калгас уступіў я ў пачатку васьмідзесятых гадоў і тады быў у нас добры прыбытак ад гаспадарання. Цяжкасці пачаліся ў дзевяностых гадах, з увядзеннем рэформаў. Зараз на сваім таксама складана гаспадарыць. Яшчэ крыху ёсць прыбытку ад продажу малака, — заяўляе Міхал Раманюк.

Апошнім часам Малочны кааператыў у Гайнаўцы рашыўся закрыць скупку малака ў вясковай малачарні з-за невялікай колькасці сыравіны і вялікіх коштаў утрымання пункту скупкі. Тамара Раманюк узяла ў кааператыве ў арэнду ўмяшчальнік і прымае малако на сваім панадворку.

Яна Супэла спатыкаю на панадворку. Падаў ён дакументы на атрыманне структурнай пенсіі.

— Не рашыўся яшчэ канчаткова ці пераходзіць на структурную пенсію. Хаця ў пачатку жніўня завёз я дакументы, не атрымаў яшчэ адказу. Некалькі разоў трэба было рабіць папраўкі, але аказалася, што яшчэ не ўсё вырашана зверху ў справе гэтай пенсіі. Жонка малодшая за мяне і таму ёй не належыцца дадатак. З наступнага года выдатна будзе павышана складчына ў КРУС і таму не ведаю колькі мне застанецца, заплаціўшы складчыны за сябе і жонку. У наступным годзе скончу я 60 гадоў і таму можа лепш будзе мне пайсці на ранейшую пенсію з КРУСу, — гаворыць Ян Супэла. — Я перапрацаваў 30 гадоў у розных прадпрыемствах і таму, папрацаваўшы яшчэ 2 гады, мог бы перайсці на вышэйшую пенсію з ЗУСу. Але зараз няма здароўя, каб абрабляць поле і дадаткова працаваць.



Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

*Дом і гаспадарчыя будынкі Ян Супэла збудаваў у васьмідзесятыя гады*

Гаспадары, якія рашацца выступіць за структурнай пенсіяй, могуць атрымаць ад 960 злотых да 1 920 злотых у месяц (на рукі). Рэнта такая прыдзяляецца на гаспадарку. Калі структурная пенсія належыцца мужу і жонцы, то сямейства атрымлівае дадатак — 300 злотых у месяц. Каб атрымаць гэтую пенсію, земляроб павінен скончыць 55 гадоў, прынамсі 10 гадоў весці гаспадарку і 5 гадоў аплачваць складчыну сельскагаспадарчага грамадскага страхавання ў КРУС. Структурная рэнта прыдзяляецца на 10 гадоў. Нават 64-гадовы гаспадар можа выступаць за атрыманне такой пенсіі і будзе яна выплачвацца яму да 74 года жыцця. У выпадку малодшых гаспадароў мусяць яны адводзіць са структурнай пенсіі складчыну ў КРУС (ажно да 65 года жыцця).

— Ёсць гаспадары, якія стрымаліся з падачай дакументаў на атрыманне структурнай пенсіі і чакаюць, покі малодшыя за іх жонкі скончаць 55 гадоў жыцця, бо тады атрымаюць на іх 300 злотых дадатку, — паясняе Мікола Яноўскі.

Калі памрэ муж, які атрымліваў структурную пенсію, то яна пераходзіць на жонку, што атрымлівала толькі невялікі дадатак. Рэнта не належыцца жонцы, якая ў дзень смерці мужа не скончыла 55 гадоў. Застанецца яна без сродкаў да жыцця да часу, ажно атрымае звычайную пенсію (але мусіць увесь час аплачваць складчыну ў КРУС).

— Калі гаспадару і яго жонцы належыцца структурная пенсія, я заахвочваю пераходзіць на яе. Найлепш, калі бацькі перапішуць поле на дзяцей, бо тады застанецца яно ў сям'і, будуць грошы на жыццё і аплачванне складчын у КРУС. Дасягнуўшы 65-гадовага ўзросту гаспадар будзе атрымліваць звычайную пенсію з КРУСу і частку структурнай пенсіі, — гаворыць Мікола Яноўскі.

**Аляксей Мароз**

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714
**Nakład**: 1 981 egz.
**Выдавец**: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
**Старшыня**: Яўген Вапа.
**Адрас рэдакцыі:** 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
**Тэл./факс:** (+48 85) 743 50 22.
**Internet**: *http://niva.iig.pl/*
**E-mail**: *redakcja@niva.iig.pl*
*Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.*
**Галоўны рэдактар:** Яўген Вапа.
**Намеснік гал. рэдактара:** Віталь Луба.
**Сакратар рэд.:** Аляксандр Максімюк.
**Рэдактар „Зоркі":** Ганна Кандрацюк-Свярубская.
**Публіцысты:** Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран-Асташэвіч.
**Канцылярыя:** Галіна Рамашка.
**Камп'ютэрны набор:** Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
**Друкарня**: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
**Prenumerata:** 1. Termin wpłat na prenumeratę na I kwartał 2005 r. upływa 5 grudnia 2004 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na I kwartał 2005 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,45 zł, a kwartalnie — 44,85 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta BPH PBK SA Oddział w Białymstoku 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.

## *„Даўціпы” Андрэя Гаўрылюка*

Ноч, вялікі пажар, які тушаць сем пажарных каманд. Да камандзіра пажарнікаў падыходзіць нейкі мужчына і пытае:

— Як справы: ніхто з пажарнікаў не пацярпеў?

— На вялікі жаль, — адказвае камандуючы, — двух нашых асталося ў агні, а шасцярых цяжка абгарэлі. Затое ж выратавалі з пажару шаснаццаць чалавек!

— Шаснаццаць? Там быў толькі ахоўнік...

— Адкуль вы гэта ведаеце?

— Я з'яўляюся загадчыкам гэтага морга.

***

Умірае цешча. Лежачы ў ложку водзіць вачыма за лятучаю мухаю. Зяць павучае яе:

— Няхай мама не рассяроджваецца!

***

Між сябрамі:

— Думаю адкрыць бар на Сахары.

— Там жа няма людзей...

— Але ці ўяўляеш, якая ў іх будзе смага, калі з'явяцца!

***

Вуліцай ідзе загадчык фірмы.

— Добры дзень, пан прэзас, — зачапляе яго жабрак.

— Добры дзень. Вы мяне знаеце?

— Так; працаваў калісь у вашай фірме, але вы мяне звольнілі.

Загадчык пайшоў далей.

— Добры дзень, пан прэзас, — зачапляе яго чарговы жабрак.

— Вітаю. Вы мяне знаеце?

— Так; працаваў калісь у вас, але вы мяне звольнілі.

Далей загадчык бачыць чарговага бедака, які варочае ў сметніку.

— Добры дзень, пан прэзас, — адзываецца шукальнік.

— Добры дзень. Ці вас таксама я звольніў?

— Не, я яшчэ ў вас працую, але цяпер у мяне перапынак на ленч.

***

Двух сябраў у парку:

— Хацеў бы я мець столькі грошай, колькі лістоўя на гэтай ліпе, — марыць адзін.

— Ці падзяліўся б ты імі са мною?

— Навошта дзяліцца? Вазьмі сабе другое дрэва.

***

Ветэрынар звоніць Кавальскай:

— У мяне сядзіць ваш муж з сабачкам і просіць яго ўсыпіць. Ці вы згодны на гэта?

— Безумоўна! А сабачку можаце пусціць самапасам, бо ён ведае дарогу дадому.

***

Ноччу Андрэй вяртаецца дадому пасля п'янкі. Жонка спіць, у спальні цёмна. Гаспадар удараецца аб мэблю і знерваваны ўпрошвае:

— Ты, Маруся, пачынай наракаць, бо не магу знайсці ложак.

***

Гутараць два жыды:

— Адкуль маеш такі гадзіннік?

— Як бацька ўміраў, то мне прадаў.

**Бібліятэка Музея і асяродка беларускай культуры ў Гайнаўцы запрашае на аўтарскі вечар Міры Лукшы „Нетутэйшыя тутэйшыя”, які адбудзецца 9 снежня 2004 года (чацвер) а 17⁰⁰ у кіназале Музея.**

# Музычныя навіны

**Музыкі гурту, — чытаем на сайце гурту „Zet”** (http://www.radzima.com), — зараз знаходзяцца ў дабрачынным падарожжы па Паўднёвай Амерыцы. Яны змагаюцца супраць вынішчэння трапічных лясоў і збяднення народных масаў. Гэтай справай „зэтаўцы” займаюцца ўжо чатыры месяцы. Таму, раптоўна выйшаўшы ў Сеціва, яны былі вельмі здзіўленыя тым, што ў эфіры Белтэлевізіі з'явілася песня „Калгас”, якую быццам бы выконвае вышэйзгаданая каманда, музыкамі якой яны і з'яўляюцца. Адміністратару гэтае старонкі патэлефанавалі Стронг і Канцлер і паведамілі, што яны нічога не ведаюць пра гэтую песню і кліп, але, пачытаўшы тэкст у Нэце, раяць галасаваць за. Яшчэ яны зазначылі, што запісваюць там, у Амерыцы, новы альбом і неўзабаве беларуская грамадскасць будзе дзіка радасная, шакаваная, шчаслівая і незадаволеная...




Зэтавец Канцлер




Зэтавец Акрабат

**Дуэт Аляксандра і Канстанцін паўстаў у кастрычніку 1998 года ў горадзе Барысаў.** Стварылі яго Аляксандра Кірсанава ды Канстанцін Драпеза. На працягу шасці гадоў існавання А&К выступалі на многіх мерапрыемствах у Беларусі і свеце. З'явіліся тры альбомы „За сінімі за марозамі” (2001), „Сойка” (2003) і „Лепшае” (2004). У гэтым годзе дуэт быў абраны прадстаўніком Беларусі ў фестывалю Еўравізіі. Музыку іх цяжка назваць. Безумоўна фольк з элементамі сучасных гучанняў. Слухаючы песень А&К за кожным разам адчуваем побач сябе ўсябытную ў песнях прыроду. На гэты момант Аляксандра і Канстанцін працуюць над новым чацвёртым альбомам. На афіцыйным сайце гурту http://aik.fromby.net можна паслухаць навейшую песню „Дададуду”, якая будзе складаць гэты альбом. На канец трэба ўспомніць, што А&К гэта артысты дзяржаўнага канцэртнага аркестра Рэспублікі Беларусь.



**Татка Стэп**

# Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — афарызм Ілоны Бодэн.

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
| 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 |
| 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 |
| | | | | | 25 | 26 | 27 |
| | | | | 28 | 29 | 30 | 31 |
| | | | 32 | 33 | 34 | 35 | 36 |
| | 37 | 38 | 39 | 40 | 41 | 42 | 43 |
| | | | | | | | 44 |
| | | | | | | 45 | 46 |
| | | 47 | 48 | 49 | 50 | 51 | 52 |

1. дарожка ў парку абсаджаная дрэвамі або кустамі = 4 _ 32 _ 24 _ 31 _;
2. вірнік або ціхонь, міфічны ўладар вадаёмаў = 15 _ 14 _ 9 _ 10 _ 11 _ 20 _ 30 _ 29 _;
3. не ніз = 17 _ 46 _ 3 _ 1 _;
4. рака, якая ўліваецца ў Амур у Благавешчанску = 35 _ 27 _ 28 _;
5. любіць узяць = 40 _ 41 _ 42 _ 43 _;
6. ядомы пласціністы грыб з рыжай шапачкай = 12 _ 16 _ 13 _ 18 _ 5 _;
7. музычны твор з некалькіх п'ес аб'яднаных адзінствам задумы = 37 _ 33 _ 36 _ 6 _ 7 _;
8. важная шышка = 25 _ 48 _ 19 _;
9. частка вupражы з клешчамі = 52 _ 51 _ 50 _ 44 _ 47 _;
10. кругавая пасудзіна Яна Чыквіна = 22 _ 21 _ 8 _ 2 _;
11. ежа = 45 _ 34 _ 23 _;
12. унутраная частка жывой клеткі або атама = 38 _ 39 _ 49 _ 26 _.

**(ш)**

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

**Адказ на адгаданку з 43 нумара**

Бацька, зло, заяц, клір, люцічы, салон, сем, Ціта.

Рашэнне: **Кастрычнік зямлю балоціць, а лес залоціць.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Аляксандру Дабчынскаму** з Беластока і **Валянціне Марціновіч** з Краснага Сяла.

# 5.11 – 11.12



**Баран (21.03. — 19.04.)** Не перабольшвай сваёй прабойнасці; і твае „рогі” могуць хутка сцерціся. Не бяры на сябе зашмат, асабліва не цягай мэблі з кута ў кут. Калі хочацца новага, дык купі сабе цёплыя шкарпэткі.

**Бык (20.04. — 20.05.)** І нашто было хаваць галаву ў пясок; ты ж не страус! Калі гаворыш зашмат, памятай, што каму гаварыў, бо канфрантацыя прынясе сорам. Магчымасць падзарабіць, але больш у планах.

**Блізняты (21.05. — 21.06.)** Новы тэлевізар — новае акно ў свет, ды ці не лепш праводзіць час у кампаніі? Варта паразлічвацца са старых грахоў, чым хутчэй да новага года, тым лепш. Амур страляе, ды чамусьці не ў твой бок.

**Рак (22.06. — 22.07.)** Свае новыя погляды варта аддаць у музей на праверку, хто на іх раней за цябе ды як выйшаў. Можаш купіць патрэбную рэч, якая будзе насіцца так добра, аж табе абрыдне. Варта змяніць прычоску, мо нават толькі падраўняць валасы; будуць добра расці.

**Леў (23.07. — 22.08.)** Можаш расхадзіцца, быццам цябе адвязалі з прывязі ў цырку. Ахвота большая, чым магчымасці, але крыху намуціш у атачэнні. Не кажы „гоп”, калі не выпадае скакаць, асабліва праз палаючае кола. Можа, не зусім адпаведнае чытаеш у чыіхсьці вачах.

**Дзева (23.08. — 22.09.)** Дзева, нават „старая”, у гэтым тыдні хваліцца будзе цнатлівасцю, гожасцю, здароўем. Праўда, варта купіць кроплі ад вачэй, каб паправіць бачанне праўды.

**Шалі (23.09. — 23.10.)** Можаш есці і піці ўсё, на што табе прыйдзе ахвота. Праўда, варта і папасціць, перад Калядамі, якія ўжо не за гарамі. Рыхтуй падарунак пад ёлку таксама і свайму кату (сабаку, канарэйцы, мужу...).

**Скарпіён (24.10. — 21.11.)** Зноўку ходзіш заробленая, а „хвасты” здаецца, гоняць цябе. Кінь ты такое! Работа не заяц, а сну не саснеш наперад ні назад. Варта пасядзець з сябрамі за віном ці гарачай гарбатай. Сам іх запрасі, ці выберыся кудысьці.

**Стралец (22.11. — 21.12.)** Вучням: страляць трэба было раней, каб праверыць сваю меткасць. Але і так добра трапілі. Мяркуйце, як правесці... наступныя канікулы. Чакаюць вас навіны.

**Казярог (22.12. — 20.01.)** Падумай аб мінулым і прыгадай усё добрае. Добры час завяршыць справы ва ўстановах. Да суседзяў варта азвацца першым. Асабліва старшэйшыя могуць шмат і табе памагчы.

**Вадалей (21.01. — 19.02.)** Думаеш пра недасягальнае? Здаецца табе, што далёкае! Найчасцей сараміш сябе за чужыя правіны. А чакае цябе вельмі творчы тыдзень, нават сны будуць цябе інспіраваць.

**Рыбы (20.02. — 20.03.)** Вораг не спіць, дык бяссонніца пашкодзіць нервы ягоныя, не твае. Супакойся! Не натужвайся на працы, папрыбірай на сваім сталe, выкінь непатрэбшчыну з кутоў. Можаш прымяніць прынцыпы кітайскага фенг-шуі ва ўстановах мэблі і рэчаў у хаце.

**Агата Арлянская**

ISSN 0546-1960